ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ 5

ЯК ЗАРАБІЦЬ АГРАРЫЮ?

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 САКАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 54 (28921)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый МУРЫН, начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка:

«Тэндэнцыя, трэнд на паступовае зніжэнне працэнтных ставак будзе захоўвацца. Але шмат што залежыць ад таго, як складзецца ўзровень інфляцыі ў краіне, што будзе з інфляцыйнымі чаканнямі (па нашых ацэнках, яны цяпер у два разы перавышаюць фактычны ўзровень інфляцыі). Нацбанк будзе працаваць над тым, каб інфляцыя захоўвалася ў найбліжэйшыя пяць гадоў на ўзроўні не больш за 4-5 %. Асноўныя намаганні будуць накіраваны на кантроль над грашовым прапанаваннем, гэта ключавы фактар, які забяспечваў бы цэнавую стабільнасць».

Нашчадкі зямлі старажытнай

Фота Анатоля КІПІШУКА.

Падлеткі з аграгарадка Друя Браслаўскага раёна.

КАРОТКА

- Жыхары Беларусі ў 2019 годзе будуць кампенсаваць каля 80,5 % выдаткаў на аказанне паслуг ЖКГ (з улікам павышэння тарыфаў з 1 студзеня).
- **Акцыя «Дзень памяці» пройдзе 22 сакавіка ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**
- На правядзенне веснавых палявых работ у Беларусі ў 2019 годзе неабходна Br1 млрд 821,4 млн.
- **Франтавы бамбардзіроўшчык Су-24 устаюць у Гомелі.**
- У сувязі з пачаткам школьных канікул ДАІ заклікае кіроўцаў абавязкова зніжаць хуткасць у дварах.

ПАСЛЯЗАЎТРА ЎЖО БЛІЗКА

На заводзе «Штадлер Мінск» вырабілі новую версію цягніка для мінскага метро

Фота Андрэя САЗОНАВА.

СТАР. 2

Узровень

Андрэй КАРОЛЬ:

«Студэнтаў трэба задзейнічаць у кухні па «прыгатаванні» ведаў»

Рэктар БДУ пра нешаблоннае мысленне, эўрыстычнае навучанне і адмаўленне ад маналогу

Амаль паўгода таму на Савеце БДУ былі агучаны стратэгічныя мэты развіцця ўніверсітэта: сярод іх фігуравалі павышэнне якасці адукацыі, выбудоўванне кадравай палітыкі з апорай на рэальныя дасягненні супрацоўнікаў, павелічэнне колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу з вучонымі ступенямі і нават уваходжанне ў 1 % найлепшых універсітэтаў свету. Як вядзецца работа па рэалізацыі пастаўленых задач? Каго павінен рыхтаваць універсітэт: вузкіх прафесіяналаў ці асоб з фундаментальнай падрыхтоўкай і шырокім кругаглядам? Без якіх навыкаў нельга абысціся ў сучасным свеце? Аб усім гэтым мы гутарым з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктарам педагагічных навук, прафесарам Андрэем КАРАЛЁМ.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Працягваецца падпіска на II квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

ПРАЦА НА РЭПУТАЦЫЮ

Рэалізацыя праектаў са «Штадлер» сур'ёзна падымае імідж Беларусі

Учора Прэзідэнт Беларусі сустрэўся са старшынёй адміністрацыйнага савета, уладальнікам кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Петэрам ШПУЛЕРАМ.

Перш за ўсё кіраўнік дзяржавы падзякаваў кіраўніцтву кампаніі за выкананне сваіх абяцанняў. Паводле яго слоў, «Штадлер» вядомы ва ўсім свеце, і тое, што ў Беларусі з'явілася адно з прадпрыемстваў брэнда па вытворчасці розных відаў транспарту, тым ліку і электрычнага, «сур'ёзна падымае імідж нашай краіны».

Ён таксама адзначыў, што памятае сустрэчу з Петэрам Шпулерам — «у электрычцы», — на якой удалося хутка дамовіцца аб сумеснай працы. «І сёння падумаў пра тое, калі б у нас усё так хутка прасоўвалася, як стварэнне вашага прадпрыемства ў Беларусі, было б зусім нядрэнна», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт дадаў, што рабочая сустрэча з'яўляецца не толькі падставай успомніць пачатак супрацоўніцтва, але і — галоўнае — падумаць пра будучыню. «Натуральна, я гатовы абмеркаваць усе пытанні, якія ў вас з цягам часу паўсталі. Можа быць, ёсць нейкія прапановы. Калі ёсць праблемы для вырашэння — вы кажыце, мы пастараемся іх вырашыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы выказаўся з нагоды новых саставаў для мінскага метро, якія прадпрыемства прадставіла днямі. «Я шмат чуў, што вы стварылі нейкі цудацягнік для нашага метро. Можа, вы пра яго нешта раскажаце, а можа, падчас пастаноўкі на рэйкі гэтага цягніка мы з вамі пракоцімся яшчэ раз на ім. Можа, у гэтай электрычцы ў нас з'явяцца новыя ідэі, як калісьці», — з усмешкай дадаў беларускі лідар.

У адказ Петэр Шпулер адзначыў, што ў Фаніпалі сёння вырабляюцца цягнікі не толькі для патрэб Беларусі, але і для сусветнага рынку. «Я павінен сказаць, што нам даводзіцца працаваць ва ўмовах вельмі жорсткай канкурэнцыі», — заўважыў ён.

Нагадаем, 20 лістапада 2014 года Аляксандр Лукашэнка і кіраўнік кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Петэр Шпулер афіцыйна адкрылі завод «Штадлер Мінск» у Фаніпалі. Кошт праекта склаў каля 50 млн еўра.

Сёння ў рамках дагавора, заключанага паміж ЗАТ «Штадлер Мінск» і Мінскім метрапалітэнам, ідзе распрацоўка і вытворчасць 10 саставаў для наяўных, а таксама для трэцяй лініі сталічнага метро, якая будуецца. Вырабляецца інавацыйны рухомы састаў, які не мае аналагаў у краінах СНД.

* * *

Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі старшыня адміністрацыйнага савета, уладальнік кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Петэр Шпулер пагутарыў з журналістамі.

Ён нагадаў, што кампанія пачала сваю працу ў нашай краіне сем гадоў таму «абсалютна ў чыстым полі». «Мы стварылі новую сучасную вытворчасць, мабыць, самую сучасную ва ўсёй групе кампаній «Штадлер», — сказаў Петэр Шпулер. — Цяпер мы выпрацоўваем у год 1,2 мільёна вытворчых гадзін, у нас тысяча работнікаў, мы працуем на поўную магутнасць».

Уладальнік кампаніі звярнуў увагу, што беларускі стандарт якасці цалкам адпавядае нямецкаму або швейцарскаму, а таксама на тое, што ў нашай краіне вельмі добра падрыхтаваныя і адукаваныя супрацоўнікі. Дзякуючы гэтаму завод у Фаніпалі працуе не толькі на айчынны рынак, але выходзіць і на міжнародны.

«Як уласнік «Штадлера», магу сказаць, што я ў захапленні тымі ўмовамі працы, тымі эканамічнымі ўмовамі, якія мы сустракаем тут. Гэта не ў апошнюю чаргу датычыцца прафесійнай падрыхтоўкі нашых супрацоўнікаў, гэта вялікі знак якасці, на мой погляд, для любой нацыянальнай эканомікі. І гэта з'яўляецца вялікім спрыяльным фактарам таго, што мы можам выконваць выдатныя здзелкі і рабіць усё гэта тут, у Мінску», — дадаў ён.

Уладальнік кампаніі «Штадлер» расказаў, што ў яго была размова з начальнікам Беларускай чыгункі Уладзімірам Марозавым. Гаворка ішла пра тое, што ў Асіповічах існуе вытворчасць грузавых вагонаў. «Да нас паступіла прапанова пасадзейнічаць продажу, збыту гэтай прадукцыі на рынках Заходняй Еўропы. Зараз мы якраз займаемся прапрацоўкай гэтага пытання, пакуль што ўсё выглядае нядрэнна. Спадзяюся, што мы тут зможам з Беларуссю выбудаваць добрае супрацоўніцтва», — адзначыў бізнесмен.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ПАСЛЯЗАЎТРА ЎЖО БЛІЗКА

У першым цягніку — чатыры вагоны. Паміж імі ёсць скразны праход з шырокім пераходам, які ператвараe яго ў адзіны састаў. Так што не трэба тоўпіцца каля першага вагона дзеля ўяўнага першынства. А яшчэ ў канцы і ў пачатку цягніка ёсць зоны для пасажыраў з абмежаванай мабільнасцю з прыстасаваннямі для фіксацыі.

У аснове дызайну асобнага вагона — колеры герба Мінска: сіні, белы і чырвоны. Для ўнутранага дызайну вагонаў характэрнае прымяненне светлых адценняў, лаканічныя формы і цэласнасць прасторы. Кузаў вагона ўяўляе сабой суцэльнаметалічную канструкцыю з тэрмінам службы 50 гадоў.

Фота Андрэя САЮНАВА.

Інвестыцыі-плюс

— Гэты праект для нас асабліва дарагі, — сказаў **першы віцэ-прэм'ер краіны Аляксандр ТУРЧЫН,** які прысутнічаў на прэзентацыі новага саставу. — Практыка паказвае, што можна і трэба інвеставаць у нашу краіну.

Як эканаміст, ён адразу звярнуў увагу на пэўныя параметры прадпрыемства: інавацыйнасць і годная аплата працы. Паказчык сапраўды ўражвае. Больш за тысячу супрацоўнікаў атрымліваюць у сярэднім каля 2000 рублёў зарплаты. Далей — дыверсіфікацыя экспарту. Больш за палову прадукцыі ідзе на Захад.

Старшыня савета дырэктараў «Штадлер Рэйл Груп» Петэр ШПУЛЕР адзначыў, што кіраўніцтва кампаніі не шкадуе аб тым, што інвеставала ў гэты завод 90 млн еўра. Тут выпускаецца прадукцыя, канкурэнтная ва ўсім свеце. Вось цягнік, які адправіцца ў Нарвегію, гэтыя двухпавярховыя саставы паедуць у Венгрыю. Ёсць заказы са Славеніі і Азербайджана. У фокусе супрацоўніцтва знаходзіцца рынак Лацінскай Амерыкі. Для Балівіі тут будуць вырабляць трамваі. Дарэчы, развіваецца і ўсходні кірунак: у верасні паставяць першыя вагоны трамваяў у Санкт-Пецярбург. Ім нават назву расіяне прыдумалі — «Чыжык».

Летась мясцовы завод прадаў 120 алюмініевых вагонаў. Гэта добры паказчык. «А сёлета заводу запланавана зрабіць яшчэ 310 вагонаў для сябе і іншых прадпрыемстваў. Гэта ўжо 20 працэнтаў ад агульнай магутнасці групы «Штадлер», — удакладніў **Філіп БРУНЕР, дырэктар «Штадлер Мінск».**

Дарэчы, Петэр Шпулер прыехаў у нашу краіну не адзін. Ён захапіў з сабой у якасці яшчэ аднаго інвестара бельгійца Люка Така. Бізнесмен шмат чуў пра беларускія тэхналогіі і спецыялістаў. І ў першую чаргу Люка Така цікавіць супрацоўніцтва ў хімічнай галіне і сельскай гаспадаркі. У нашу краіну ён прыехаў з выразным жаданнем: стварыць сумесную вытворчасць па выпуску прынцыпова новага ўгнаення.

Старт у лістападзе

З завода ў Фаніпалі новы цягнік метро даставяць у Мінск па чыгунцы. Хоць новыя цягнікі і заказалі для трэцяй лініі метро, чакаць запуску наступнай веткі ў метрапалітэне не стануць. Цягнік трэба спачатку абкатаць і сертыфікаваць. «Мы ж не паставім яго ў тупік і не будзем чакаць, пакуль здасца трэцяя лінія», — удакладніў сваю пазіцыю **галоўны інжынер Мінскага метрапалітэна Ігар ШАСТАКОЎ.** Новыя вагоны з'явяцца спачатку на 2-й лініі метро, дзе цягнікі пачнуць эксплуатаваць дзесьці ў кастрычніку-лістападзе. Да гэтага іх будуць абкатваць уначы без пасажыраў.

У цэхах цягніка значныя перавагі: ён хутчэйшы і больш плаўна разганяецца. Але на хуткасці паездак і інтэрвале паміж цягнікамі гэта не адаб'ецца: хутчэй у метрапалітэне не трэба, у нас не той пасажырапаток. Па словах галоўнага інжынера, сярэдняя хуткасць цягнікоў — 40 км/г. Новы цягнік разганяецца да 80 км/г, гэта забяспечыць захаванне мінімальнага інтэрвалу ў час пік.

У новых цягніках будзе значна цішэй — як у кабіне машыніста, так і ў пасажырскім салоне. Гэта за кошт гукаізаляцыі кузава. У вагонах ёсць раздымы USB па пяць вольт для зарадкі тэлефонаў, ноўтбукаў і планшэтаў.

Для трэцяй лініі

Ужо сёлета завод паставіць шэсць саставаў для патрэб участка трэцяй лініі. Да моманту, калі здадуць першы ўчастак, цягнікі ўжо павінны быць абкатаныя, а брыгады сфарміраваныя. Машыністы будуць праходзіць навучанне, каб асвоіць новую тэхніку.

Для хуткай пасадкі і высадкі пасажыраў прадугледжаны прасторныя ўваходныя пляцоўкі. Для павышэння бяспекі зона каля дзвярэй выдзелена жоўтым колерам. Сядзенні ў салоне размешчаны ўдоўж, яны мацуюцца да бакавых сцен вагона. У галаўных вагонах у непасрэднай блізкасці ад уваходных дзвярэй абсталявана зона для перавозкі асоб з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама прадугледжаны дадатковыя адкідныя сядзенні.

На кузаве галаўнога вагона ўстаноўлены лічбавыя відэакамеры вонкавага відэаназірання ўздоўж саставу, якія забяспечваюць машыністу неабходны агляд. У салоне кожнага вагона таксама ўстаноўлены чатыры лічбавыя відэакамеры сістэмы відэаназірання.

Усяго ў нашым метро зараз 360 вагонаў. А прызначаны тэрмін службы гэтых вагонаў складае 31 год. Таму ёсць праграма планаў па метрапалітэне — да 2035 года памяняць каля 200 вагонаў. Хай яны будуць прыгожымі і добрымі. А інавацыі павінны павялічыць нарматыўны тэрмін службы, а таксама падоўжыць міжрамонтны прабег. Бо новы цягнік эканамічна расходуе электраэнергію. А гарантыйны тэрмін эксплуатацыі новых цягнікоў ад «Штадлера» — 560 тысяч кіламетраў прабегу.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Італіі кіроўца з Сенегала падпаліў школьны аўтобус з 51 дзіцем

У Італіі затрымалі 47-гадовага кіроўцу, выхадца з Сенегала, які падпаліў аўтобус з дзецьмі ў адказ на гібель мігрантаў у Міжземным моры. Як паведамляе The Telegraph, кіроўца школьнага аўтобуса заявіў, што помсціць за тысячы мігрантаў-афрыканцаў, якія патанулі ў Міжземным моры, спрабуючы дапłыць да Еўропы.

«Ніхто не выжыве. Спыніце гібель людзей у моры, або я ўчыню разню», — пагражаў ён, паводле слоў супрацоўнікаў паліцыі.

Кіроўца вёз у аўтобусе 51 вучня сярэдняй школы недалёка ад горада Крэмона на спартыўнае мерапрыемства. Па дарозе ён рэзка змяніў напрамак у бок суседняга Мілана. Ён накіраваў аўтобус у аўтамабілі на ажыўленай трасе, перш чым яго спыніла паліцыя. Затым ён абліў аўтобус бензінам і падпаліў.

Паліцэйскія разбілі вокны ў транспартным сродку, праз якія ўсе дзеці паспяхова эвакуяваліся. Сама меней 12 дзяцей даставілі ў бальніцу з-за ўдыхання прадуктамі гарэння і шоку.

СМІ: для бяздомнага 8-гадовага чэмпіёна па шахматах з Нью-Ёрка сабралі $178 тысяч

Васьмігадовы бежанец з Нігерыі Тані Адвевумі пасля перамогі на чэмпіянаце штата Нью-Ёрк па шахматах у сваёй узроставай катэгорыі прыцягнуў увагу многіх амерыканцаў і ўжо атрымаў ад іх дапамогу, якая дазволіць яму працягнуць заняткі гэтай гульнёй.

Як паведаміла газета The New York Times, дзясяткі людзей пачалі накіроўваць ахвяраванні сям'і юнага шахматыста, якая дзякуючы гэтаму змагла перабрацца з гарадскога прытулку для бяздомных у арандаваную кватэру.

Пра яшчэ чэмпіёна сярод навучэнцаў трэціх класаў, які аказаўся ў нью-ёркскім прытулку, стала вядома на мінулым тыдні таксама з публікацыі The New York Times. І адразу ж пасля гэтага, літаральна за тры дні, спачувальнікі сабралі для сям'і Адвевумі больш за $178 тысяч.

ЗВАНІЦЕ Ў СУБОТУ

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 23 сакавіка ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах.

З 9.00 да 12.00 іх правядуць:

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Уладзімір Віктаравіч ДАМАНЕЎСКІ. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Пасля «Вялікай размовы»

Эксперыментальны маршрут будзе

Падчас акцыі «Задай пытанне Прэзідэнту» сваю праблему агучыла Ніна Лявоненка, жыхарка аграгарадка Камунар Буда-Кашалёўскага раёна. Жанчына напісала: «Да самай блізкай чыгуначнай станцыі 4 кіламетры, да аўтобуснай — 2. Ад нас ходзяць толькі прыватныя маршруткі. Але цэны ў іх прыстойныя, а льгот для інвалідаў і пенсіянераў няма. Ды і калі інвалід калясачнік, то ўвогуле няма магчымасці паехаць у абласны цэнтр. У раён яшчэ аўтобус пару разоў ходзіць, а ў Гомель няма. Маладым дайсці да суседніх вёсак яшчэ магчыма. А што рабіць пенсіянерам і інвалідам? Ці нельга паспрыяць таму, каб далі нам аўтобус да Гомеля хоць бы некалькі разоў на дзень?».

Цяпер Камунар з абласным цэнтрам звязвае рэгулярны прыгарадны экспрэсны маршрут Гомель — Камунар. Па ім штодзень выконваецца 58 рэйсаў у прамым і зваротным напрамках. Маршруткі абслугоўвае прыватны перавозчык. Сёння кошт паездкі на маршрутцы ад Камунара да Гомеля складае 2,5 рубля. **Дырэктар ПТУП «Скартранссэрвіс» Іван СКАРАХОДАЎ** адзначыў, што трымае мінімальную цану для пасажыра, які едзе на такую адлегласць. Дарэчы, гэта каля 30 кіламетраў.

Як расказаў **генеральны дырэктар ААТ «Гомельаблаўтатранс» Дзмітрый СТАРАСЦЕНКА,** з 1 красавіка аграгарадок Камунар Буда-Кашалёўскага раёна з Гомелем звяжа эксперыментальны аўтобусны маршрут. Ён будзе арганізаваны па серадах і пятніцах. Аўтобусы прыгараднага маршрута Буда-Кашалёва — Гомель (цераз Акцябр) будуць заязджаць у Камунар. Адпраўленне з Камунара — у 9.30 і ад аўтавакзала ў Гомелі — у 17.20. Эксперымент будзе доўжыцца тры месяцы. Разліковы кошт складае 1,96 рубля. Плюс калі чалавек мае права на льготы паводле заканадаўства — адпаведна з імі.

Генеральны дырэктар ААТ «Гомельаблаўтатранс» падкрэслівае, што сацыяльны стандарт па транспартным абслугоўванні насельніцтва Камунара перавыконваецца. Дарэчы, у 2015 годзе аўтобусны парк № 1 ужо ажыццяўляў перавозкі па прыгарадным маршруце Гомель — Камунар, аднак яны былі спынены, бо акупнасць за 11 месяцаў 2015 года склала толькі 26,2 %.

Між тым ад Камунара да раённага цэнтра ёсць рэгулярныя прыгарадныя маршруты філіяла «Аўтобусны парк № 1». Так, па маршруце Буда-Кашалёва — Камунар кожны дзень выконваецца восем рэйсаў у прамым і зваротным напрамках (акрамя нядзелі). Таксама дзейнічае маршрут Уваравічы — Камунар. Гэта два рэйсы ў прамым і зваротным напрамках штодня, акрамя нядзелі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Перспектыва

БЯСПЕЧНЫ ГОРАД СТВОРЫМ РАЗАМ

Ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС адкрыўся сумесны беларуска-кітайскі даследчыцкі цэнтр. Яго мэта — распрацоўваць сучасныя сродкі засцярогі ад надзвычайных сітуацый. Мяркуецца, што цэнтр стане адукацыйнай і эксперыментальнай пляцоўкай, закліканай зрабіць унёсак у бяспечную будучыню.

Стварэнне цэнтра стала магчымым дзякуючы рэалізацыі Нацыянальнай стратэгіі па зніжэнні рызыкі ўзнікнення надзвычайных сітуацый на 2019—2030 гады. За гэты час трэба будзе стварыць новую мадэль кіравання бяспекай гарадскога асяроддзя, якая дазволіць актыўна рабіць прафілактыку і кіраваць рызыкамі.

— Стварэнне беларуска-кітайскага даследчыцкага цэнтра — гэта паказальны крок у пытаннях стратэгічнага супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю, — адзначыў **першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Аляксандр ХУДАЛЕЕЎ**. — Мы вельмі ўдзячны кітайскаму боку за дапамогу ў стварэнні цэнтра. Тут будуць распрацоўвацца праграмныя комплексы і сістэмы бяспекі, якія ўкараняцца як на аб'ектах, так і ў цэлым у горадзе. У тым ліку і тыя, якія датычацца транспартнай інфраструктуры.

Падчас рэалізацыі канцэпцыі бяспечнага горада будуць выкарыстоўвацца самыя сучасныя тэхналогіі: інтэрнэт рэчаў, big data, штучны інтэлект і інфармацыйныя мадэлі аб'ектаў. Усё гэта дазволіць спрагназаваць надзвычайную сітуацыю і выпрацаваць меры для папярэджання інцыдэнтаў, а таксама як мага раней апавясціць насельніцтва і арганізаваць выратавальную працу.

— Універсітэт грамадзянскай абароны вылучаецца сваімі навуковымі дасягненнямі, — заўважыў **пасол Кітая ў Беларусі Цуй ЦЫМІН.** — У гэтай галіне ёсць чаму вучыцца ў нашых беларускіх партнёраў. Увогуле, само стварэнне цэнтра ідзе на карысць народаў абедзвюх краін. І гэта вельмі важны праект для рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

Інавацыйны праект з'явіўся дзякуючы вялікай супрацы Інстытута даследаванняў грамадскай бяспекі ўніверсітэта Цынхуа, кампаніі GSafety і Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Беларусі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Надвор'е

Амаль без ападкаў, але вецер...

Сіноптыкі абяцаюць узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с

У трэцяй дэкадзе сакавіка ў нас захоўваецца даволі цёплае надвор'е з тэмпературным фонам на 3—7 градусаў вышэй за кліматычную норму. А ў наступныя выхадныя дні, пры чаргаванні атмасферных франтоў і абласцей павышанага ціску, чакаецца няўстойлівае надвор'е, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага ціску і істотных ападкаў не прагназуецца. У многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 6 да плюс 11 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — да 13 цяпла. І ў суботу надвор'е ў асноўным стане вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па крайнім паўночным захадзе краіны магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы месцамі па ўсходзе захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 3 градусаў да плюс 2 градусаў, удзень — плюс 6—13 градусаў, па паўднёвым захадзе — 14—16 цяпла.

А вось у нядзелю чарговая сістэма атмасферных франтоў з поўначы-захаду Еўропы прынясе новую порцыю вільготнага паветра. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, днём у крайніх паўднёва-ўсходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 1 да плюс 7 градусаў, удзень будзе 6—12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы прагназуецца без істотных ападкаў, удзень пераважна па паўночна-заходняй палове краіны кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. Ноччу ў асобных раёнах слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Уначы чакаецца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 3—10 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Сталічны ЧАС

● У мінскіх гатэлях расце колькасць замежных пастаяльцаў. Па стану на пачатак гэтага года ў сталіцы функцыянавалі 45 гасцініц і сем гасцінічных комплексаў, паведамілі агенцтву «Мінск-Навіны» ў Галоўным статыстычным упраўленні Мінска. Летась тут спыніліся 584,2 тысячы замежных гасцей, з іх 367,3 тысячы — грамадзяне СНД. Найбольшая колькасць прыходзілася на жыхароў Расійскай Федэрацыі — 312,5 тыс., Кітая — 18,8 тыс., Германіі — 16,6 тыс., Літвы — 14,9 тыс., Польшчы — 13,8 тыс. Сярэдні кошт пражывання ў гатэлі беларускай сталіцы ў мінулым годзе склаў 94,2 рубля ў суткі (у 2017-м — 88 рублёў).

● У Мінску плануецца змяніць сістэму работы з неэксплуатуемым аўтатранспартам. Пра гэта паведаміў на пасяджэнні рабочай групы па пытаннях утрымання і добраўпарадкавання тэрыторый сталіцы першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Дзяніс Драпей, перадае карэспандэнт БелТА. Новыя падыходы мяркуюць вызначэнне адзінага аператара, адказнага за вываз і захоўванне кінутых машын, таксама прадугледжана арганізацыя дзевяці парковак, на якія будзе эвакуіравацца аўтахлам.

Будзь у курсе!

Здаў сеткі — пазбегнуў адказнасці

Пачынаючы з 20 сакавіка і на працягу ўсяго нерастава-га перыяду Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь праводзіць маштабную кампанію па канфіскацыі браканьерскіх сетак. Грамадзянам прапануецца добраахвотна здаць іх, пры гэтым прыцягваць да адказнасці за захоўванне забароненых прылад лоўлі іх не будуць.

У перыяд веснавога нерасту вылаў рыбы сеткамі наносіць найбольшую шкоду яе ўзнаўленню. Прычыненую шкоду, якую кампенсуюць парушальнікі, вылічваюць па трайных таксах. Таму інспектары стараюцца адбіраць браканьерскія прылады да таго, як яны трапяць у вадаём, а іх гаспадары нажывуць масу праблем і фінансавых абавязацельстваў. Напрыклад, 18 сакавіка ў Столінскім раёне дзяржінспектары затрымалі траіх браканьераў, якія сеткамі налавілі больш за 40 кілаграмаў рыбы (45 ляшчоў і інш.). Цяпер ім трэба пакрыць амаль чатыры тысячы рублёў шкоды. Калі б яны папаліся пасля ўвядзення нераставаў забароны (з 20 сакавіка) — ім прыйшлося б заплаціць каля 12 тысяч рублёў.

Адказнасць за захоўванне сеткаматэрыялаў і гандаль імі была ўведзена ў студзені 2018 года артыкулам 15.36 КаАП Рэспублікі Беларусь. Палова канфіскаваных летась сетак (145 кіламетраў з 309 кіламетраў) былі выяўленыя якраз у працэсе захоўвання або пры спробе рэалізацыі. Уладальнікам забароненых прылад лоўлі давялося заплаціць немалыя штрафы.

У дачыненні да фізічных асоб санкцыя артыкула прадугледжвае ад 5 (127,5 рубля) да 50 (1275 рублёў) базавых велічынь штрафу, а ў дачыненні да прадпрымальнікаў, якія рызыкнулі падзарабіць на продажы сетак, — ад 10 (255 рублёў) да 200 (5100 рублёў) базавых велічынь.

У Дзяржінспекцыі папярэджваюць: нягледзячы на тое, што заканадаўчая норма, якая забараняе захоўванне і рэалізацыю сетак, дзейнічае ўжо больш за год, далёка не ўсім вядома, што нават старыя дзедаўскія сеткі, якія вісяць на гарышчы, могуць стаць прычынай для разгляду. Здаць такі «арсенал» можна абсалютна без наступстваў пры ўмове добраахвотнай выдачы.

Здарэнні

Скралі старыя тэлевізары

А на атрыманыя грошы зладзілі пікнік

У аператыўна-дзяжурную службу Лельчыцкага РАУС звярнуўся жыхар адной з вёсак раёна. Мужчына паведаміў аб тым, што невядомы, узламаўшы аконную раму, пранік у яго дачны дом, адкуль выкраў пяць старых тэлевізараў марак «Рэкорд», «Бярозка», «Гарызонт», «Віцязь» савецкай вытворчасці і стацыянарны тэлефон.

Супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх хутка ўстанавілі невядомых, якія пакваліліся на чужое дабро. Імі былі трое мясцовых юнакоў, якія не дасягнулі паўналецця. Двое раней траплялі ў поле зроку міліцыі па фактах ужывання спіртнога. Як паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама, прыяцелі вырашылі сустрэць першыя цёплыя дні выхадам на прыроду. Пытанне з фінансаваннем пікніка вырашылі за кошт дачніка. Выкраўшы тэлепрыёмнікі, яны разабралі іх на запчасткі. Тыя, дзе быў каляровы метал, здалі. Атрыманыя грошы патрацілі на цыгарэты і мяса для шашлыка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Студэнтаў трэба задзейнічаць у кухні па «прыгатаванні» ведаў»

Калі няма гатовых рэцэптаў...

— Андрэй Дзмітрыевіч, ці падзяляеце вы думку, што дыплом як траставы сертыфікат універсітэта страчвае сваю значнасць? Адукацыя робіцца беспарапынным працэсам, «канструктарам» з ведаў, якія чалавек можа перасабраць, прычым неаднойчы за сваё жыццё...

— Я так бы радыкальна пра абясцэньванне дыплома ўсё ж не казаў, бо ён усё роўна застаецца важнай часткай біяграфіі чалавека — і навуковай, і прафесійнай, неад'емным складнікам партфоліа любога прафесіянала. Нас заўсёды ацэньваюць, усё мае сваё вымярэнне, у тым ліку і ў адукацыі. Таму для кагосьці заўсёды будзе важна, якую ВНУ ты скончыў. Але на рынку працы адбываюцца сур'ёзныя змены, якіх нельга не заўважаць: у знешнім асяроддзі яны больш імклівыя, чым у сферы адукацыі. У сілу сваёй традыцыйнай кансерватыўнасці ўніверсітэт і школа, не толькі ў нас, але і ўвогуле ў свеце, не заўсёды за імі паспяваюць.

Я, напрыклад, ведаю ІТ-кампаніі, кіраўнікоў якіх у значна большай ступені цікавіць, што ты ўмееш рабіць, і ў меншай — які ў цябе дыплом. Гэта пакуль не масавая практыка ў Беларусі, але пэўныя тэндэнцыі ўжо прасочваюцца. Свет паскараецца, робіцца стаўка на высокую тэхналагічнасць, змяняюцца погляды работадаўцы на тое, хто яму патрэбны, многія прафесіі адыходзяць у мінулае. Пакуль у нас у прыярытэце дыплом, але я не выключаю, што праз 20—30 гадоў будзе па-іншаму. Дарэчы, Марк Цукерберг, адзін з заснавальнікаў самай папулярнай сацыяльнай сеткі, сказаў: «Фэйсбук» — шыкоўны вопыт, мне проста пашанцавала. Але я шкадую, што не давучыўся ў каледжы, дзе табе даюць больш, чым ты ведаеш. Там ты проста атрымліваеш задавальненне, адкрываючы свет...»

— А як ва ўмовах нявызначанасці, калі пра будучыню мала што вядома, можна спраектаваць свой асобасны і кар'ерны рост?

— Трэба зразумець, што няма гатовых рэцэптаў і шаблонаў. І чым далей, тым болей непрадказальным будзе наша жыццё. Таму вучыць трэба не чамусьці канкрэтнаму. Філосафы кажуць, што самае сапраўднае веданне — гэта веданне аб сваім няведанні. І мы павінны вучыць студэнтаў бачыць вобласць свайго няведання, выходзіць за межы стэрэатыпаў, глядзець на рэчы з розных бакоў, бачыць будынак не толькі з

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Андрэй КАРОЛЬ: «Вельмі цяжка навучыць студэнта мысліць нестандартна...»

фасада. **Але ці можна глядзець на свет нестандартна і нешаблонна, калі табе транслююць стандартную шаблонную інфармацыю, упакаваную і расфасаваную па розных дысцыплінах і вучэбных планах?** Гэта прыводзіць да таго, што з кожнай гадзінай у маладога чалавека з'яўляецца ўсё больш гатовых ведаў. Несці сумку ўсё цяжэй, але самае крыўднае, што, пакуль гэтыя веды яму транслююцца, яны ўжо паспяваюць састарэць.

Упэўнены, што студэнтам і школьнікам трэба вучыцца не канкрэтным ведам, а ўменню адкрываць сябе. І праз вывучэнне сябе вывучаць знешні свет, а не наадварот. Трэба выяўляць свае магчымасці, вучыцца ставіць мэты. Каб пабудаваць уласную траекторыю, калі няма дакладных арыенціраў, трэба абапірацца на свой патэнцыял, але для гэтага яго трэба раскрыць.

Патрэбны не «кладаўшчыкі», а стваральнікі

— Як вы лічыце: лекцыйная форма заняткаў сябе яшчэ не зжыла? Наколькі правільна падаваць веды на сподачку ў гатовым выглядзе? Можа, трэба пераходзіць да дыялогу?

— А чаму мы лічым, што лекцыя павінна абавязкова праходзіць у форме маналогу? Маналагічнасць адмаўляе перш за ўсё самастойны, творчы характар спасціжэння навучэнцамі навакольнага свету. **Звычайная трансляцыя інфармацыі працуе на «склад», на падрыхтоўку «кладаўшчыка», а не на выхаванне стваральніка свайго поспеху.** Вельмі цяжка навучыць мысліць нестандартна, калі адукацыйны працэс звесці да паведамлення шаблоннай інфармацыі ў выглядзе правіл, схем, класіфікацый, тэарэм і заканамернасцяў. Перадатачны характар адукацыі, заснаваны на інфармацыйным падыходзе, прыводзіць да таго, што студэнт на занятках іграе пасіўную ролю, следуючы за логікай выкладчыка. І тут ужо ўзнікае шэраг пытанняў. **Ці заўсёды тое, што нам даюць, мы бяром? Ці заўсёды тое, што ўзялі, становіцца нашым? І калі мы бяром, ці заўсёды прымнажаем?**

У нашай рэчаіснасці быць экіпіраваным ведамі яшчэ не азначае ўмення іх прымяняць. Атрыманае ад іншых, як правіла, страчваецца. Чаму студэнты часта кажуць: «Зразумеў я многае, але нічаму не навучыўся»? Каштоўнасць ведаў залежыць ад спосабу атрымання, але студэнтаў і навучэнцаў пазбаўляюць магчымасці ўдзельнічаць у кухні па іх «прыгатаванні». Сістэма трансляцыі загадзя правільнай інфармацыі не развівае творчы пачатак, які ёсць у кожным з нас...

Вядома, лекцыйная форма заняткаў будзе трансфармавацца, і ў нашым універсітэце ўжо многія выкладчыкі адмаўляюцца ад маналогу. Ёсць выкладчык і ёсць студэнт, настаўнік і вучань — і ад таго, як арганізаваны паміж імі дыялог, у вялікай ступені залежыць канчатковы вынік.

— У мінулым годзе ў БДУ быў створаны міжуніверсітэцкі партал «Крэатыўная адукацыя: метадалогія, змест, практыка». Ці стаў ён пунктам росту для сістэмы крэатыўнай адукацыі?

— Мы стваралі адкрытую інтэрактыўную інтэрнэт-пляцоўку з магчымасцю дыстанцыйнага ўдзелу ў яе рабоце ўсіх ахвотных і наладжвання дыялогу. Як я ўжо казаў, для падрыхтоўкі сучасных спецыялістаў, якія будуць запатрабаваныя наймальнікамі, патрабуецца пераход ад маналагічнага характару навучання да дыялогу, іншая метадалогія навучання, калі студэнта вучаць не браць «чужое», а ствараць уласны адукацыйны прадукт па кожнай канкрэтнай тэме. Я не магу сказаць, што кінутае ў зямлю зерне вырасла за год у буйное дрэва, было б наіўна меркаваць, што змяненні будуць адбывацца з такой хуткасцю, але пэўная частка педагогаў паглядзела на сваю дзейнасць пад іншым вуглом.

Эўрыстычнае навучанне, на якое мы робім стаўку, гэта навучанне на аснове дыялогу, якое раскрывае вучня. Студэнту прапануецца не ўзяць напрамую і засвоіць дасягненні чалавецтва, а вывучаць аб'екты рэчаіснасці (прыроды, тэхнікі, культуры, навукі) самастойна, па прапанаваным педагогам алгарытме. Найважнейшым элементам эўрыстычнага навучання выступае адкрытае заданне, на якое ў кожнага можа быць свой адказ і якое раскрывае ўнутраны патэнцыял навучэнца, матывуе яго на пошукі. Функцыі выкладчыка/настаўніка пры гэтым таксама змяняюцца: ён не дае веды, а арганізоўвае іх пошук. На другім этапе сваё супастаўляецца з чужым — назапашанымі чалавецтвам ведамі ў рамках пэўнай вучэбнай тэмы. У выніку студэнт здзяйсняе ўласныя адкрыцці, спазнае сябе... **У дыялагічнасці навучання закладзена магчымасць асабістага росту для студэнта ці школьніка:** апошні вучыцца ставіць уласныя мэты, супастаўляць, аналізаваць, дыскутаваць, развівае свае крэатыўныя якасці, стварае ўласны адукацыйны прадукт... І пытанні ён задае ўжо не інфармацыйнага плана, а аб'ёмныя, якія выходзяць за межы аднаго прадмета, у яго фарміруецца цэласнасць свету.

«Ведаю ІТ-кампаніі, кіраўнікоў якіх у значна большай ступені цікавіць, што ты ўмееш рабіць, і ў меншай — які ў цябе дыплом. Гэта пакуль не масавая практыка ў Беларусі, але пэўныя тэндэнцыі ўжо прасочваюцца».

Партал — гэта люстэрка дзейнасці нашых педагогаў. На ім размяшчаюцца і праводзяцца ў анлайн-рэжыме тэматычныя вебінары, круглыя сталы, семінары і канферэнцыі, дыскусіі, абмяркоўваюцца адукацыйныя стандарты, вучэбныя праграмы, тэхналогіі навучання.

Усе распрацоўкі выкладчыкаў БДУ ў сферы крэатыўнай адукацыі рэалізуюцца ў навучальным працэсе. Праведзена ўжо звыш 80 эўрыстычных заняткаў і каля 60 інтэрнэт-заняткаў, якія арыентаваныя на фарміраванне асобы студэнта, вучаць яго правільна ставіць мэты, супастаўляць, аналізаваць і ствараюць умовы для самарэалізацыі. На партале можна знайсці метадычныя распрацоўкі выкладчыкаў БДУ, апісанне іх майстар-класаў, відэапрэзентацыі перадавога педагагічнага вопыту, навукова-метадычныя артыкулы выкладчыкаў па актуальных праблемах развіцця ўніверсітэцкай адукацыі.

Фінансы і псіхалогія

— Андрэй Дзмітрыевіч, адна з задач, якую вы ставілі перад сабой пасля прызначэння на пасаду рэктара БДУ, — амаладжэнне кадравага складу. Скажыце, а ці лёгка маладому вучонаму зрабіць кар'еру ў БДУ? Напрыклад, стаць дэканам факультэта ці загадчыкам кафедры?

— У БДУ сёння працуюць больш як 2700 выкладчыкаў. Я лічу, што галоўнае ўсё ж такі не ўзрост, а гатоўнасць да перамен. І для мяне важна, каб на кіруючую пасаду прыйшоў той, хто хоча перамен. У гэтага чалавека гараць вочы, ёсць свая стратэгія, бачанне, што можна зрабіць на маленькай кафедры (а іх у нас 154), каб рэалізаваць стратэгічныя мэты ўніверсітэта. Можа быць, ён менш ведае, чым той, хто шмат ведае, але не хоча далейшага прагрэсіўнага руху. Калі аперыраваць лічбамі, то **кожны чацвёрты загадчык кафедры ў нас змяніўся. Сярэдні ўзрост новых загадчыкаў — 44 гады. І прыкладна кожны трэці дэкан у нас таксама новы. Іх сярэдні ўзрост — 39 гадоў. Амаладзілася таксама прыкладна 50 працэнтаў прарэктарскага корпуса. Сярэдні ўзрост новых прарэктараў — 47 гадоў.** Напрыклад, наш прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі абараніў доктарскую ў 36 гадоў. Я лічу, што гэта добры прыклад для іншых. Новаму дэкану геаграфічнага факультэта — 38 гадоў, фізічнага — 37 гадоў. Гэта людзі не з вуліцы — яны выраслі і сфарміраваліся як прафесіяналы на сваім факультэце.

— Вы ўкаранілі механізм рэйтынгавай аплаты працы ўсіх катэгорый супрацоўнікаў універсітэта. Як калектыў паставіўся да гэтага наваўвядзення?

— Спадзяюся, з разуменнем. Абмеркаванне ў працоўных калектывах доўжылася больш як чатыры месяцы, мы шмат дыскутавалі, улічылі кожны голас. Па выніках рэйтынгавых ацэнак, выстаўленых за 2018 год, штомесячная дадатковая прэмія была прызначана 30 працэнтам выкладчыкаў БДУ.

У рэйтынгавай сістэме вынікі ацэньваюцца па аб'ектыўных крытэрыях, якія адлюстроўваюць вучэбна-метадычную, навуковую, арганізацыйную і выхаваўчую работу выкладчыкаў. Тэхнічная ўнікальнасць рэйтынгу прафесарска-выкладчыцкага складу заключаецца ў поўнай аўтаматызацыі працэсаў выстаўлення рэйтынгавай ацэнкі, разліку і прызначэння прэмій. Гэта дазваляе мінімізаваць суб'ектыўны фактар пры аналізе паказчыкаў эфектыўнасці работы выкладчыкаў.

Унутрыўніверсітэцкі рэйтынг паспрыяў таму, што многія супрацоўнікі цяпер задаюць пытанні накшталт «Якія параметры мне трэба закрыць, паб падняцца ў рэйтынгу?..». І справа тут не толькі ў фінансах, але і ў псіхалогіі. А мы, між іншым, бачым, што нават для таго, каб нам утрымацца ў двух працэнтах найлепшых універсітэтаў свету, трэба, каб кожны супрацоўнік з навуковай ступенню за год падрыхтаваў і апублікаваў свой артыкул у прэстыжным навуковым выданні. Праз рэалізацыю кадравай палітыкі мы маем унікальныя і для БДУ, і для ўсёй краіны вынікі ў навуковай дзейнасці. Летась ва ўніверсітэце былі абаронены і зацверджаны 71 кандыдацкая дысертацыя і 8 доктарскіх.

І хачу дадаць, што ў нас **не было ніводнай скаргі ў апеляцыйную камісію ва ўніверсітэце,** значыць, інструменты вымярэння эфектыўнасці дзейнасці выкладчыкаў працуюць. Калі работнік не задаволены налічанымі яму баламі, ён мае права пра гэта заявіць.

— А ці можаце вы з упэўненасцю сказаць, што ведаеце, як павінен развівацца вядучы нацыянальны ўніверсітэт? Вам вядомыя рэцэпты поспеху?

— Трэба стварыць такія ўмовы, каб кожны змог рэалізаваць свой патэнцыял і гэта мела б кумулятыўны эфект для ўсяго ўніверсітэта. Вось самая галоўная ўмова. Стратэгія БДУ распрацавана толькі на тры гады, плануваць далей сэнсу няма, бо свет змяняецца вельмі хутка. Мы разумеем, што ўвайсці ў 1 працэнт найлепшых ВНУ (першыя тры сотні) надзвычай складана. На сусветным адукацыйным рынку разгарнулася рэальная вайна за дамінаванне, за права ўплываў, амаль як у спорце. І рэйтынгі — гэта пэўная маніпуляцыя. Я ведаю ўніверсітэты, якія не займаюць высокія пазіцыі ў сусветных рэйтынгах, таму што не адпавядаюць заходнім шаблонам, але яны працуюць на найвышэйшым узроўні. Рэпутацыя ВНУ — гэта індустрыя. У цябе ўкладваюць грошы, і ты займаеш высокія пазіцыі ў рэйтынгу. А чым вышэй твая пазіцыя, тым больш грошай у цябе ўкладваюць. Першая тройка і першая сотня ВНУ амаль не змяняюцца. Любога навічка тут жа пачынаюць «выпіхваць». Крытэрыі ці «правілы гульні» змяняюцца кожны год. Можна, канешне, махнуць на іх рукой, але можна разглядаць рэйтынгі, як нейкі маяк: у якім напрамку нам рухацца, як развіваць універсітэцкую навуку, як расстаўляць акцэнты ў рабоце? Публікацыйная актыўнасць нашых вучоных — вельмі важны паказчык у рэйтынгах. Значыць, будзем яе стымуляваць. Для фарміравання іміджу ўніверсітэта, яго акадэмічнай рэпутацыі прысутнасць у рэйтынгах, за якімі сочыць сусветная супольнасць, усё ж такі важная. Галоўнае — не стаяць на месцы...

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

Поўны тэкст інтэрв'ю шукайце на партале zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПІЦЦЁ НЕ СМЯЦЦЁ...

Вярнуўшыся з арміі, Кастусь, як многія іншыя тады, запісаўся на курсы шафёраў, атрымаў правы. Пасля гэтага ў яго з'явіліся праца, грошы і новыя сябры. З імі можна было хадзіць у кіно ды на танцы, ці выпіць гарэлкі. Ды каб чарку-другую, а то ж... сварыліся на Косцю бацькі.

Неяк раз вяртаецца ён з гулянкі (дома ўсе ўжо спяць), а яго, як на ліха, смага душыць. Улукаткі зайшоў у кухню (п'яны то п'яны, а помніў, што на прыпечку кампот стаіць — з сушаных яблычкаў). Абмацаў гаршчок, што называецца, прылажыўся ды заваліўся спаць.

Раніцай падымаецца на працу ісці, але ж спачатку маці паснедаць кліча. А заадно пытаецца:

— І каму гэта надурыла пойла цялячае выпіць?

— А дзе яно было? — не разумее Косця.

— Як дзе? У гаршчэчку на прыпечку.

— Дык там жа кампот заўсёды стаяў...

— Ён і цяпер стаіць...

— А я што ноччу выпіў?!

За сталом грымнуў смех.

— Малайчына, сынок, — «пахваліла» маці. — Ты ўжо цялятка стаў аб'ядаць. Так, крый бог, і да свінак дойдзеш, бо гарэлка яна такая: да добрага не давядзе, а вось да дурнога... На суседа вунь паглядзі...

Пагаварылі так бацькі ды чамусьці ўспомнілі, як Косця, малы, гуляў са стальным абручыкам і неяк жа прымудрыўся яго на шыю ўздзець: туды жалязяка лёгка ўскочыла, а вось назад — аніяк...

— Паўвёскі тады на раду сабралася, — успамінаў бацька. — На шыйцы пілаваць той абруч ніяк не выпадала. Вырашылі пастрыгчы нагала — «пацяплела» як быццам. Намылілі галаву, пагалілі — усё роўна то нос замінае, то вушы... Думалі, у школу пойдзеш з «ашыйнікам».

— Падумаеш — страх вялікі, — насупіўся Косця. — Ну, хадзіў бы з «ашыйнікам» — цяпер гэта модна.

— А зручна як, — засмяяўся бацька. — На ланцуг бы зараз навязалі, можа, гарэлкі не піў бы.

— П'яніцу знайшлі, — пакрыўдзіўся сын і выскачыў з-за стала.

...Ён тады быў аматарам выпіць. А вось «прафесіяналаў» і сапраўды не лішне было б пасадзіць на нейкі ланцуг?

Галіна Нічыпаровіч,

в. Магільна, Уздзенскі раён.

КУФЭРАК АДЧЫНЯЎСЯ ПРОСТА...

Неяк перад развалам Саюза давялося пабыць у адной кампаніі, пабачыць бы паслухаць беларуса, які ў канцы вайны трапіў у палон, застаўся ў Англіі. Родныя ведалі пра яго, што жывы, — і ўсё: пісьмаў не пісалі, у размовах не згадвалі, бо скажы каму, што радня за межамі, — бог ведае, чым гэта скончыцца... Вось і маўчалі, пакуль «жалезная заслона» не рухнула. А ўжо тады — прыехаў свояк у родную вёску.

За сталом, апроч іншага, зайшла размова пра дробныя крадзяжы — пра тое ж малако з фермы ці збожжа з гумна...

Здзівіўся прыезджы: «А як гэта?»

Яму кажуць, што ўсё ж вакол калгаснае... І пытаюць: «А ў вас хіба не так?»

Адказ «англічаніна» прымусіў мяне яшчэ больш запаважаць тэхнічны прагрэс. Рэч у тым, што працаваў наш зямляк на кандытарскай фабрыцы, дзе вытворчасць была добра аўтаматызаваная. Гэта значыць, што «дозы» ўсіх кампанентаў адмяралі аўтаматы. «І калі ў выраб не трапляла пэўная колькасць прадукту, — расказваў зямляк, — канвеер проста спыняўся. З-за чаго і з-за каго — знаходзілі тут жа».

Амаль у той жа час мая знаёмая працавала на камбінаце кааператыўнай прамысловасці, дзе выпякалі хлеб, баранкі, кексы... «Цягнулі мы ўсяго патроху», — расказвала жанчына. — «А як жа ахова? — здзівіўся я. — Чаму прапускала?» — «А чаму б не прапускаць, калі ў сумках нічога... Мы іншае прыдумалі. За агароджай раслі кусты вербалозу і сярод іх — адзін клён. Перад канцом змены самыя смелыя беглі да плота, адсоўвалі гнілаватую дошку, пералазілі на іншы бок. І ўжо там падвешвалі на дрэва торбачкі з крадзеным. Зручна: з-за лістоў ды кустоў ніхто нічога не бачыць, сабакі не дастануць... А пасля змены можна смела выйсці за прахадную і ўсё забраць.

Ведалі пра гэты «канал» нямногія людзі, — працягвала жанчына, — і ўсё ішло добра, пакуль аднойчы торбачкі... не зніклі. Не аказалася іх і ў наступную змену. Сталі пільнаваць. Бачым — з гэтага боку да лаза ніхто не падыходзіць... Значыць, з таго... Але хто?

Таямніца адкрылася зусім нечакана. Неяк на камбінат прыйшла былая работніца, якую мусілі пайсці на пенсію. А ёй так крыўдна было, што нехта застаўся, што па-ранейшаму зарабляе ды яшчэ і крадзе... Яна ведала як... Ну і здымала».

«Чым жа гэта скончылася?» — пацікавіўся я. — «А тым, што на камбінат прыйшоў новы дырэктар, паставіў агароджу з бетонных пліт. А потым і новае абсталяванне, з якім ужо не ўкрадзеш».

Вось так. Куфэрак адчыняўся проста...

Валерый Гаўрыш,

г. Чавусы.

ВЯРТАННЕ БЛУДНАГА МУЖА

Кожная нешчаслівая сям'я нешчаслівая па-свойму — заўважыў некалі класік. Шчасце маіх суседзяў Зосі і Андрэя некалі рассыпалася, як той картачны домік, а потым...

Зрэшты, пачынаць прыйдзецца здалёк.

Некалі мой сусед Андрэй уладкаваўся працаваць шафёрам у будаўнічым трэсце. Спачатку быў, што называецца, на падхваце: з банка ды ў банк вазіў бухгалтарак, па справах — намеснікаў і толькі потым — самога кіраўніка. А што — праца не пыльная, Андрэю падабалася. Тым больш што шэф паспрыяў сям'і ў атрыманні добрай кватэры. Ён жа, ідучы на нейкую нараду, не прымушаў кіроўцу тупа чакаць, пакуль яна скончыцца, а моўчкі дазваляў «пабамбіць», гэта значыць на казённай машыне зарабіць сабе грошай. У сям'і, дзе расло двое жэўжыкаў, яны заўсёды былі дарэчы, а калі стала здавацца, што ўжо і дастаткова, Андрэй стаў крыху заціскаць... На ўсякі пажарны... Нібы ведаў, што выпадак такі надарыцца.

І сапраўды: на нечым пагарэў-такі ягоны шэф-дабрадзей — паляцеў з пасады. Следам за ім без працы застаўся кіроўца. Трохі патаксаваў на сваёй машыне, як на казённай. Не дзіва, што дабіў (бо нешта паправіць прывычкі не меў), а горш за тое — учыніў аварыю, на два гады пазбавіўся правоў. І вось тут ужо сарваўся — стаў выпіваць. Штодня...

Скончылася гэта банальна: жонка сабрала ягоныя рэчы і выставіла за дзверы.

Вось так Андрэй апынуўся ў сваёй старой аднапакаёўцы — нядобрай кватэры, бо хутка ўсе п'яніцы ведалі, што ў ёй можна выпіць, пагуляць у карты і нават паспаць. Гаспадар за гэта мала браў — выпіць ды нешта з'есці. Ён лічыў, што вось так нават эканоміць — не траціць сваю заначку.

Яе, пакуль жыў з сям'ёй, Андрэй трымаў у гаражы. Цяпер — пабаяўся, што жонка знойдзе, і перанёс у кватэру. Схованку зрабіў у канапе, якую на першым годзе сямейнага жыцця прывезлі з камісійнай крамы і ў якой ад былых гаспадароў засталася праедзеная мышамі дзірка ў тканіне, што абцягвала спінку ззаду. Туды спакойна пралазіў кулак... Андрэю заставалася купіць адмысловых цвікоў, прыбіць імі тканіну па перыметры і адзін цвічок «адкусіць», каб той абы трымаўся ў рэйцы.

Карацей, схованка была — лепш не трэба! Як яму здавалася. Але ж...

Недзе праз месяц бадзяжнага жыцця Андрэй з пнеўманіяй загрымеў у бальніцу. Жонка ды дзеці, пачуўшы пра гэта, ну вядома ж, захацелі наведаць — і яго, і потым сваю былую кватэру, навесці там нейкі парадак і ўрэшце... выкінуць старую канапу.

— Можа, ранавата яе на сметнік? — спытала адна з суседак, пачуўшы шум.

— Самы раз, — адказала Зося. — У кватэры яшчэ адна ёсць — лепшая.

— А можна гэту я забяру? На дачу.

— Ды калі ласка!

Жонка — дазволіла, а вось Андрэй, пачуўшы пра гэта, як не звар'яцеў: раззлаваўся, пакрыўдзіўся, а галоўнае, тут жа... паправіўся — папрасіўся дамоў.

...Суседка — не старая яшчэ ўдава — убачыўшы ў вочка, што цвяродзы яму адчыніла. (Канапа стаяла ў калідоры. Андрэй аж сеў на яе з той радасці.)

Гаспадыня прапанавала грошы (хоць старая, але ўсё ж такі мэбля). «Госць» адмовіўся, а вось чаю — дык папрасіў.

СКАРПІЁН. Захоўвайце спакой і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Прафесійныя і фінансавыя справы палепшацца дзякуючы вашай настойлівасці і самааддачы. З'явіцца жаданне змяніць не толькі свой імідж, але і ўнутраны стан. Вас відавочна натхняе блізкі чалавек. Вашы любоўныя пачуцці ўзаемныя. Ініцыятывы аўторка ўвянчаюцца поспехам, калі ўдасца ўтаймаваць нервовасць і не працаваць звыш меры. У суботу, перш чым нешта вырашаць або прадпрымаць, праявіце стрыманасць і разважлівасць.

СТРАЛЕЦ. У гэтыя дні разлічвайце толькі на свае сілы, бо дапамога іншых можа аказаць вам «мядзведжую паслугу», наступствы якой потым будзе цяжка выправіць. Затое зможаце праявіць сябе. У чацвер парадуюць пазітыўныя падзеі і цікавыя сустрэчы. Субота падыходзіць для гутарак з сябрамі і сямейных застолляў. Нядзелю лепш прысвяціць адпачынку ў адзіноце.

КАЗЯРОГ. Калі зберацеся, то будзеце здольныя здзейсніць скачок у кар'еры. У панядзелак верагодныя адказныя перамовы і здабыццё новых дзелавых партнёраў. Вы справядліва мяркуеце, што вартыя большага. Але не бярыце павышаныя абавязацельствы, пры цяперашнім тэмпе працы, вам складана будзе іх выканаць.

ВАДАЛІЎ. Неабходна прыслухацца да голасу розуму, а не ісці на повадзе ў сваіх жаданняў і запалу. У пачатку тыдня будзеце шмат кантактаваць і знаёміцца з новымі людзьмі. Паспрабуйце зрабіць прыемнае ўражанне з першых слоў. Каб у чацвер таемныя нядобразычліўцы не засталі вас знянацку, мабілізуйце свой розум і сілы ды падрыхтуйцеся супрацьстаяць іх атакам. У канцы тыдня адчуеце павышэнне жыццёвага тонусу, а невялікія замінкі ў справах застануцца ў мінулым.

РЫБЫ. На гэтым тыдні плюсоў і мінусаў у прафесійных і асабістых справах будзе пароўну, аднак у цэлым тыдзень спрыяльны, асабліва для творчых пачынанняў. Настрой і працаздольнасць будуць на вышыні, калі вы вызначыце для сябе пэўныя мэты і зловіце кураж. У асабістай сферы не выключаны авантурныя матывы, якія неўзабаве могуць ператварыцца ў цэлую мелодыю, пад якую вам давядзецца скакаць. Аднак, калі паспрабуеце ўтаймаваць сваю ўпартасць, то цалкам зможаце захаваць у сям'і мір і спакой.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.08	19.26	12.18
Віцебск —	6.58	19.16	12.18
Магілёў —	6.58	19.16	12.18
Гомель —	6.55	19.12	12.17
Гродна —	7.24	19.41	12.17
Брэст —	7.25	19.42	12.17

Месяц

Поўня 21 сакавіка. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. Наталлі, Валерыя, Дзмітрыя, Івана, Ільі, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сяргея, Тараса.
К. Катарыны, Багуслава, Захарыя, Паўла, Казіміра.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

22 САКАВІКА

У краіне

1809 год — нарадзіўся (г. Слуцк) Кандрат Ільіч Карсалін, мастак, акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Ужо з 14 гадоў стаў працаваць памочнікам іканапісцаў. Першыя ўрокі партрэтнага майстэрства атрымаў пад кіраўніцтвам Т. Геса — выкладчыка Слуцкай гімназіі. З 1838 года — вольны слухач Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, дзе ў 1839-м атрымаў званне пазакласнага мастака. Да 1843 года знаходзіўся ў складзе Рускай духоўнай місіі ў Пекіне. Там ён шмат працаваў у жанры партрэта, першым з беларусаў маляваў Пекін. Памёр у 1884 годзе.

1943 год — фашысцкія карнікі спалілі беларускую вёску Хатынь і яе жыхароў. Загінула 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей. У жывых засталіся толькі пяцёра дзяцей і адзін дарослы — Іосіф Камінскі. У 1969 годзе на месцы вёскі ўзведзены мемарыяльны комплекс у памяць пра ахвяр фашызму ў Беларусі.

1944 год — адбыўся бой партызанскіх брыгад імя Жукава і «Камсамолец» па разгроме нямецка-фашысцкага гарнізона ў г. п. Мір, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Мірскі бой. План знішчэння гарнізона (150 гітлераўцаў) распрацаваны камандаваннем брыгады імя Жукава, агульнае кіраўніцтва аперацыяй ажыццяўляў камандзір Стаўбцоўскага партызанскага злучэння У. З. Царук. Ведаючы пароль аховы гарнізона, партызаны ў ноч на 22 сакавіка бесперашкодна праніклі ў цэнтр пасёлка, блакіравалі казарму, разграмілі ўсе ўстановы акупантаў. У выніку бою знішчана 12 гітлераўцаў, захоплена некалькі аўтамашын, шмат прадуктаў харчавання і медыкаментаў.

1991 год — створаны Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі.

1995 год — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь устанавіў найвышэйшае званне «Герой Беларусі».

У свеце

1915 год — нарадзіўся Георгій Сцяпанавіч Жжонаў, савецкі і расійскі акцёр, народны артыст СССР. У 1939—1946-м і 1947—1954-м рэпрэсаваны, двойчы рэабілітаваны. Працаваў у тэатрах Магадана і Нарыльска, з 1969 года — у Дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Массавета. Здымаўся ў кінастужках «Чалавек, якога я люблю», «Уся каралеўская раць», «Гарачы снег», «Экіпаж» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі. Памёр у 2005 годзе.

1925 год — у мэтах умацавання аўтарытэту камандзіра і ўзняцця баявой гатоўнасці быў выдадзены загад РВС СССР «Аб увядзенні адзінаначалля ў Чырвонай Арміі». Гэты крок стаў адным з важных элементаў ваеннай рэформы 1924—1925 гадоў.

1949 год — нарадзілася Фані Ардан, французская актрыса тэатра і кіно. Здымалася ў фільмах «Жыццё — гэта раман», «Каханне да смерці», «Меладрама» і многіх іншых.

УСМІХНЕМСЯ

Адэскі аўтасэрвіс:

— Мадам, вы ж такі гадзіну таму тэлефанавалі, што ў вас толькі бампер пабіты. А я гляджу, тут і капот, і дзверы, і шкло выбіта, і фары разбітыя...

— І што? Я ж ехала! Пакуль даехала.

У свой час Наталля захаплялася ёгай, медытацыяй і самагіпнозам... І нарэшце прыйшла да высновы, што каньяк ні кроплі не горшы!

— Вам больш падабаюцца віно ці жанчыны?

— Гледзячы які год.

Што прыгатаваць, калі ў халадзільніку толькі жалезныя рашоткі і маянэз?

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 929.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 сакавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

22 сакавіка 2019 г. № 12 (497)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

МАГІЛЁЎШЧЫНА: АЛГАРЫТМ ДЗЕЯННЯ

Фота Анатоля КІСЕЛЬЧУКА і ЕўроТА.

Магілёўшчына — гэта край вялікай прамысловасці. Магілёў, Бабруйск, Асіповічы, Крычаў — цэнтры росту эканомікі рэгіёна. Тут ствараюцца інавацыйныя прадукты, будуюцца сучасныя перадавыя прадпрыемствы, вядзецца бесперапынная мадэрнізацыя існуючых магутнасцяў. Прамыслоўцы арыентуюцца ў сваёй рабоце на высокатэхналагічную арганізацыю працы, стварэнне канкурэнтаздольнай прадукцыі. А калі на чале прадпрыемства стаіць дэпутат, можна ўпэўнена сцвярджаць, што яно паспяховае. Гэта яшчэ адзін доказ таго, што людзі ў сваіх абранніках не памыляюцца.

Трэць Магілёўшчыны пацярпела ад чарнобыльскай аварыі, але жыццё на забруджаных тэрыторыях не прыпынілася. Знамянальна, што адраджэнне самага «радыяцыйнага» раёна вобласці — Слаўгарадскага — пачалося менавіта з ініцыятыўнасці і актыўнасці самога насельніцтва. На яго тэрыторыі рэалізаваны ўжо не адзін дзясятак малых і буйных праектаў, якія дапамаглі прыцягнуць грошы тэхнічнай міжнароднай дапамогі і арганізаваць такія запатрабаваныя тут месцы для самазанятасці, стварыць цэнтры адпачынку і адукацыі для дзяцей і дарослых, зрабіць месца свайго пражывання больш камфортным і прывабным. Сёння гэты раён разам з яшчэ чатырма запусціў пакуль што беспрэцэдэнтны для Беларусі рэгіянальны праект, каб сумеснымі намаганнямі палепшыць эканамічнае становішча на сваіх тэрыторыях. Праект ажыццяўляецца па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле дэпутатаў.

Рэгіён вядомы сваімі жыватворнымі крыніцамі, помнікамі архітэктуры і гісторыі. Гасцей тут чакаюць камфортныя гасцініцы, утульныя сядзібы, дамы адпачынку, здраўніцы. Колькасць замежных турыстаў летась значна ўзрасла, і тэндэнцыя працягвае захоўвацца.

Магілёўская вобласць гэта яшчэ і буйны сельскагаспадарчы рэгіён. Вялікая ўвага тут аддаецца падрыхтоўцы кадраў для сяла. Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках — найстарэйшая і найбуйнейшая шматпрофільная ўстанова аграрнага кірунку сярод краін СНД і Еўропы. Вопыт і веды горацкіх вучоных заўсёды дапамагалі выбудаваць эфектыўную стратэгію вядзення сельскагаспадарчай галіны. Усё гэта разам і ёсць Магілёўшчына. Людзі, народныя абраннікі, улада — яе непасрэдныя рухавікі і ствараль нікі.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3—16-й стар.

КАДРАВАЕ ПЫТАННЕ

МАТЫВАВАЦЬ АГРАРЫЯ

Падчас V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які праходзіў летась у Магілёве, сельскай гаспадарцы была прысвечана цэлая секцыя. Адной з надзённых праблем у гэтай галіне называлася праблема кадраў. Размова ішла аб тым, што не ў поўнай меры задзейнічаны навуковы і прафесарска-выкладчыцкі патэнцыял, ёсць пытанні па бесперапыннай адукацыі. Удзельнікі секцыі прыйшлі да высновы, што трэба кардынальным чынам мяняць працэс перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў. На гэтую тэму «МС» пагутарыла з вядомым у Беларусі вучоным-аграрыем, дырэктарам Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама ў Горках Якавам ЯРОЦКІМ.

стар. 15

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Дыета для турыста

У Кіраўскім раёне наведвальнікам санаторыя прапануюць лячэбнае галаданне. Ці запатрабаваная паслуга?

стар. 13

Час наводзіць парадак

На Падняпроўі праходзіць месячнік па добраўпарадкаванні тэрыторый.

стар. 15

Змена лідараў

У Дрыбінскім раённым Савеце дэпутатаў — новы старшыня.

стар. 16

Асілкі ў Асіповічах

Чэмпіянат краіны па гіравым спорце пройдзе ў суботу.

стар. 16

СТАБІЛЬНАСЦЬ СТЫМУЛЮЕ ЛЮДЗЕЙ

Віцэ-спікер верхняй палаты парламента Мар'яна ШЧОТКІНА здзейсніла рабочы візіт у Бялыніцкі раён, што на Магілёўшчыне.

У прыватнасці, яна наведала СВК «Калгас «Радзіма» ў рамках адзінага дня інфармавання. Гэтая гаспадарка абраная невыпадкова, піша раённая газета «Зара над Друццю». Менавіта яна з'яўляецца пляцоўкай для перайманння працоўнага і жыццёвага вопыту. Тут штогод дабіваюцца высокіх паказчыкаў у эканамічнай дзейнасці, на высокім узроўні развіты сацыяльная сфера, культура вытворчасці, адбываецца моцнае ўзаемадзеянне паміж усімі сферамі жыцця і дзейнасці вяскоўцаў праз далучэнне да гістарычнай спадчыны і традыцый, прывіцця любові і павагі да малой радзімы, да сваіх каранёў.

www.zara.by

Разам са старшынёй СВК, заслужаным работнікам сельскай гаспадаркі Аляксандрам Лапацентавым віцэ-спікер верхняй палаты парламента наведала сацыяльныя аб'екты гаспадаркі: Алею Славы, музей сельгаскааператыва, дзе азнаёмілася з гісторыяй калгаса, захаваннем працоўных дасягненняў і традыцый, якія сёння перадаюцца падрастаючаму пакаленню.

Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі працоўнага калектыву намеснік старшыні Савета Рэспублікі закранула самыя разнастайныя тэмы. У першую чаргу яна падзялілася ўражаннямі ад «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», у якой прымала ўдзел. Таксама Мар'яна Шчоткіна акцэнтавала ўвагу на аспектах дзейнасці Саюзнай дзяржавы, функцыянаванні заканадаўчай улады і сацыяльнай накіраванасці бюджэту краіны.

Падчас сустрэчы ўзнімаўся шэраг пытанняў, якія датычыліся дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, сацыяльнай абароны шматдзетных сем'яў, пенсійнага забеспячэння...

— Для таго каб жыць камфортна і ўтульна, трэба ствараць неабходныя ўмовы, — падкрэсліла Мар'яна Акіндзінаўна. — А для гэтага кожны павінен працаваць на сваім месцы. Падчас сустрэчы са старшынёй сельгаскааператыва ўпэўнілася, што тут ёсць сапраўдны гаспадар, чалавек, які нераўнадушны да праблем сваіх аднавяскоўцаў, кіраўнік з перспектыўнымі поглядамі. У вас дакладна адладжана сістэма ўзаемадзеяння ўсіх сфер жыццядзейнасці, падрастаючае пакаленне акружана клопатам з боку і школы, і бацькоў.

Наколькі прыемна бацькам бачыць, што на іх вытворчых аб'ектах вывешаны спісы з поспехамі і дасягненнямі дзяцей у школе. У той жа час і дзеці адчуваюць гонар за сваіх бацькоў у тым, што іх родзічы — перадавікі вытворчасці. Важная і матэрыяльная падтрымка — стыпендыі найлепшым вучням школы, якія аплачвае гаспадарка. У сельгаскааператыве замацоўваюцца маладыя спецыялісты, захоўваюцца традыцыі і гісторыя. Гэта з'яўляецца моцным стымулам для людзей, — ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні. Гэтым трэба не толькі ганарыцца, але і цаніць.

Маладзёжны парламентарызм

Стварэнне рэгіянальных маладзёжных парламенцкіх структур ва ўсіх абласцях Беларусі плануецца завяршыць да канца сакавіка бягучага года.

Рабочая група па фарміраванні арганізацыйных і прававых асноў дзейнасці Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе завяршыла падрыхтоўку рэгламентуючых дакументаў, якія былі прадстаўлены для абмеркавання ўдзельнікам тэматычнага семінара-практыкума, арганізаванага Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

ЗАКАНАТВОРЧАСЦЬ У ДЭТАЛЯХ

На пачатку тыдня ў Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча са слухачамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, для слухачоў акадэміі была арганізавана экскурсія, падчас якой яны азнаёміліся з дзейнасцю Савета Рэспублікі, працэдурай галасавання пры правядзенні пасяджэнняў.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па МУР Мар'яна Шчоткіна праінфармавала аб рабоце, якая праводзіцца ў Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным забеспячэнні Віктар Сірэнка і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў расказалі аб дзейнасці сваіх камісій, законапраектах, якія разглядаюцца, а таксама адказалі на пытанні слухачоў акадэміі.

НАПЯРЭДАДНІ ПАРЛАМЕНЦКАГА ВІЗІТУ

Пасол Беларусі Ігар ФІСЕНКА сустрэўся з членамі групы дружбы ў Сенаце Францыі.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы наведаў верхнюю палату парламента Францыі. Там прайшла сустрэча з членамі групы дружбы «Францыя — Беларусь». З французскага боку на мерапрыемстве прысутнічалі прэзідэнт групы дружбы Шарль Генэ, а таксама яе члены: прэзідэнт камісіі па фінансах Сената Вінсэнт Эбле і сенатары Рэнэ Данэсі, Фларэнс Лазард і Мары Мерсье.

Дыпламат і сенатары абмеркавалі планы развіцця беларуска-французскіх адносін на гэты год. Так, напрыклад, запланавалі правядзенне двухбаковых сустрэч парламентарыяў дзвюх краін, казалі пра развіццё культурнага супрацоўніцтва, а таксама арганізацыю мерапрыемстваў эканамічнага характару.

У рамках гуманітарнага супрацоўніцтва бакі абмеркавалі ўдзел прадстаўнікоў Францыі ў II Еўрапейскіх гульнях, якія павінны прайсці ў чэрвені ў Мінску.

Асаблівую ўвагу ўдзельнікі сустрэчы ўдзялілі візіту французскіх сенатараў у Беларусь у красавіку. Гэта будзе першы візіт членаў групы дружбы «Францыя — Беларусь» у нашу краіну. Летась, упершыню ў гісторыі беларуска-французскіх адносін, Сенат Францыі прыняў рашэнне стварыць групу дружбы з Беларуссю. Дзейнасць групы накіравана на пашырэнне супрацоўніцтва па-брацімскіх гарадоў Беларусі і Францыі, усталяванне прамых кантактаў паміж дзелавымі коламі, развіццё двухбаковых адносін у інвестыцыйнай, сельскагаспадарчай, экалагічнай і іншых сферах.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ДЛЯ САПРАЎДНАГА ДЫЯЛОГУ

Як ажыццяўляецца ўзаемадзеянне бізнесу і ўлады ў рэгіёнах?

Рэспубліканскі саюз прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў і дыскусійна-аналітычная супольнасць «Ліберальны клуб» прэзентавалі даследаванне «Дыялог бізнесу і дзяржавы ў рэгіёнах: як павысіць эфектыўнасць работы саветаў па развіцці прадпрымальніцтва на лакальным узроўні?».

Летась для стымулявання бізнес-ініцыятывы ў Беларусі былі створаны рэгіянальныя саветы па развіцці прадпрымальніцтва. Як новыя структуры садзейнічаюць дыялогу ўлады і бізнесу на мясцовым узроўні, расказалі прадстаўнікі Ліберальнага клуба.

«У кожнай вобласці намі былі абраны зрэзы з найбольшым і найменшым прадстаўніцтвам бізнесу і прааналізавана праца за год. І для таго каб паглядзець, як функцыянуе дыялог бізнесу і дзяржавы на рэгіянальным узроўні, мы вывучылі ўзаемадзеянне на прыкладзе Віцебскай вобласці. Намі быў апытаны шэраг лакальных бізнесменаў, прадстаўнікоў аблвыканкама/гарвыканкамаў», — расказаў аб сутнасці працы **аўтар даследавання Мікіта БЯЛЯЕЎ.**

Праект дазволіў вызначыць праблемныя пункты працы рэгіянальных саветаў па развіцці прадпрымальніцтва, якія перашкаджаюць ім стаць дзейснай пляцоўкай для дыялогу. Але ж гэта хаатычны характар працы без бачання канкрэтных задач.

«Мы вывучылі палажэнні многіх саветаў, і сфарміравалася тры мэты, якія існуюць сёння. Першая — дапамога ўсім формам уласнасці. Другая — кансультаванне бізнесу і трэцяя — выпрацоўка прапаноў», — паведаміў Мікіта Бяляеў.

Адна з умоў функцыянавання саветаў — узначальваць іх неабходна прадстаўніку бізнес-супольнасці. Па словах даследчыкаў, гэта ўмова парушаецца ў 41 % выпадкаў.

Няма адзінага падыходу да складу членаў гэтага органа. Дзесьці ёсць саветы з двух чалавек, а ў некаторых раёнах з 27 членаў. Адны з іх складаюцца толькі з прадпрымальнікаў, а ў іншых колькасная перавага ў прадстаўнікоў улады. Адна з праблем і ў тым, што бізнес-саюзы слаба ўключаны ў работу саветаў.

Выпрацаваў Ліберальны клуб і свае прапановы па вырашэнні праблем. Неабходна ўніфікацыя функцыяналу гэтых структур — стандартызацыя мэт, задач і правоў савета, што абгрунтоўвае неабходнасць падрыхтоўкі тыпавога палажэння. Распрацоўка гэтага дакумента дазволіць вызначыць ролю і месца саветаў у сістэме ўзаемадзеяння дзяржавы і бізнесу.

У склад саюзаў сёння ўключаны прыкладна 1700 прадстаўнікоў бізнесу краіны, таму ўсе саветы павінны быць у адзінай сістэме ўзаемадзеяння.

«Склад перш за ўсё павінен быць рэпрэзентатыўны ў адносінах да таго бізнесу, які знаходзіцца на тэрыторыі раёна, дзе функцыянуе савет. Калі на тэрыторыі раёна 90 % прадпрымальнікаў займаюцца гандлем, адпаведна, і ў структуры павінен быць такі ж працэнтны склад прадстаўнікоў са сферы гандлю», — акцэнтаваў увагу **суаўтар даследавання Яўген МАРДАСЕВІЧ.**

Праблемы, якія не вырашаюцца доўгі час, аўтары праекта прапануюць старшыні раённага Савета агучваць на сумесных пасяджэннях у вобласці. Мясцовыя саветы павінны мець магчымасць непасрэдна размаўляць з прадстаўнікамі ўлады і калегамі з Савета па развіцці прадпрымальніцтва, створанага пры Прэзідэнце.

Марыя ДАДАЛКА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Стаўка на канкрэтныя тэрыторыі

Старшыня Магілёўскага аблсавета Дзмітрый Харытончык пра ролю дэпутатаў у эканамічным развіцці рэгіёна

Ніводнае важнае пытанне не вырашаецца без удзелу дэпутатаў. Яны кантралююць выкананне сацыяльна-эканамічных праграм, клапоцяцца аб навядзенні парадку на зямлі, уносяць карэкціроўкі ў інвестыцыйныя праграмы. Вельмі адказна правільна размеркаваць наяўныя рэсурсы па найбольш важных аб'ектах. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці летась гэта дало магчымасць паскорыць работы па Бялыніцкай бальніцы, іншых не менш сацыяльна значных аб'ектах.

— Важна зрабіць своечасовы аналіз, ацаніць і скарэктаваць, — кажа **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.** — Гэта дазваляе больш эфектыўна распараджацца бюджэтнымі сродкамі. Але для нас важная не толькі агульная эканоміка, але і развіццё канкрэтных тэрыторый. Летась мы прынялі рашэнне, якое ўтрымлівае комплекс пэўных мер, накіраваных на актывізацыю работы ў гэтым кірунку. Будзем дабівацца, каб усе сельвыканкамы, сельсаветы мелі планы развіцця, якія павінны карэляваць з планамі развіцця раёнаў. Дэпутаты першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню арыентаваны на аказанне максімальнага садзейнічання насельніцтву ў стварэнні фермерскіх гаспадарак, развіцці народных промыслаў. Яны вядуць растлумачальную работу сярод жыхароў сваіх сельсаветаў, расказваюць, якія неабходна сабраць дакументы. Як вынік, колькасць плацельшчыкаў, што ажыццяўляюць дзейнасць па заяўляльным прынцыпе, павялічылася з 2108 чалавек у 2017 годзе да 4185 — у 2018-м, рамеснікаў з 3512 — да 4182, уладальнікаў аграэкасядзіб з 192 — да 209.

> Маладзёжныя парламенты існуюць у некалькіх нашых раёнах, плануем стварыць такое аб'яднанне і на ўзроўні вобласці. Але няма адзінай практыкі і шмат пытанняў. Зараз часцей за ўсё выбары праходзяць на базе школ, вучні вылучаюць свае праграмы, але ўзрост гэтых падлеткаў не заўсёды дапамагае ім раскрыцца.

Сістэмна працавалі камісіі па садзейнічанні самазанятасці насельніцтва, праводзіліся выязныя пасяджэнні, дзе ўсім зацікаўленым у працаўладкаванні расказвалі пра вакансіі, тлумачылі іх магчымасці. Усё гэта дало свой вынік, і тэмпы зніжэння занятых у эканоміцы запаволіліся. На 1 студзеня 2019 года па вобласці налічвалася 7710 вакансій, з іх рабочых — 4818. На гэтую дату было зарэгістравана 2042 чалавекі, якія шукалі працу. З імі пастаянна вядзецца работа. Калі саіскальнік нічога не выбраў з існуючых вакансій, яму прапаноўваюць асвоіць новую прафесію. Прыярытэты аддаюцца перанавучанню з гарантыяй працаўладкавання. Менавіта 60 % такіх грамадзян атрымалі магчымасць працаўладкавацца пад канкрэтныя заяўкі. Акрамя гэтага, для ўсіх ахвотных заняцца прадпрымальніцкай дзейнасцю прапануюцца субсідыі на арганізацыю сваёй справы.

— Навядзенне парадку на зямлі, гэта, напэўна, адна са звышзадач народных абраннікаў. Што робіцца ў гэтым кірунку?

— Летась аблсавет звяртаў асаблівую ўвагу на рэалізацыю «сотага» ўказа. Быў праведзены семінар на базе Шклоўскага раёна, у якім прынялі ўдзел усе старшыні раённых, часткова сельскіх Саветаў. На практыцы былі паказаны падыходы да працэдуры захавання старых будынкаў, як гэта правільна рабіць, калі ў адным з населеных пунктаў цэлы шэраг падрыхтаваных для зносу дамоў. Шклоўскі раён — адзін з найбольш эфектыўна працуючых у гэтым кірунку. Там жа прадэманстравалі, як выкарыстоўваюцца цяжкадаступныя для тэхнікі сельгаспрадпрыемстваў землі. Яны прапануюцца прыватнікам для вядзення бізнесу. У Шклоўскім раёне ёсць добры прыклад, як на такім месцы ў вёсцы Заброддзе быў зроблены гадавальнік раслін. На пленарным пасяджэнні дэталёва прааналізавалі, якія новаўвядзенні прапануе новы, прыняты замест «сотага», 357-ы Указ. Ён дае магчымасць больш актыўна выкарыстоўваць адчужэнне нерухомасці, прадаваць яе з аўкцыёну. Такія ж правы атрымалі і некаторыя гарады, напрыклад Бабруйск.

— Сёння ў краіне шмат гаворыцца пра стварэнне камфортных умоў пражывання на вёсцы, але гэта вялікія фінансавыя ўкладанні, якіх заўсёды не хапае...

— Таму мы і ўскладаем вялікія спадзяванні на Саветы першаснага ўзроўню, на актывізацыю работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У вобласці створана 10 440 ОТГС, з іх 8540 аднаасобных, 1900 — калегіяльных. Усяго ў органы грамадскага самакіравання было абрана 15 966 чалавек. Наша задача знайсці актыўных старастаў, дапамагчы ім арганізавацца і праз іх садзейнічанне ўцягваць грамадзян у працэс стварэння спрыяльных умоў пражывання. Добры прыклад вёска Вялікая Грава Асіповіцкага раёна. Вяскоўцы стварылі свой актыў, сфарміравалі план развіцця населенага пункта. Не менш цікавы вопыт ёсць у Дрыбінскім раёне. Жыхары вёскі Шастакі пад кіраўніцтвам старасты Ніны Сільчанка рэалізуюць сумесную з калгасам ініцыятыву. Сельгаспрадпрыемства выдзяляе зямлю, дзе насельніцтва саджае бульбу, іншыя культуры, а грошы за рэалізацыю гэтай прадукцыі выкарыстоўваюцца на вырашэнне грамадскіх пытанняў. Актыўна ва ўсім гэтым удзельнічае фермер Уладзімір Рынг. Ён дапамагае землякам і ў іншых пытаннях. Дзякуючы яму ў вёсцы ўстанавілі паклонны крыж, цяпер вяскоўцы атрымалі благаславенне на будаўніцтва новай капліцы. Вельмі важную ролю ў нашай рабоце адыгрываюць ініцыятыўныя людзі. І мы іх стараемся падтрымаць. Пры аблсавеце створана рабочая група па заахвочванні найбольш актыўных старастаў і прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання. Будзем і надалей гэта развіваць.

> Дэпутаты першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню арыентаваны на аказанне максімальнага садзейнічання насельніцтву ў стварэнні фермерскіх гаспадарак, развіцці народных промыслаў. Як вынік, колькасць плацельшчыкаў, што ажыццяўляюць дзейнасць па заяўляльным прынцыпе, павялічылася з 2108 чалавек у 2017 годзе да 4185 — у 2018-м, рамеснікаў з 3512 — да 4182, уладальнікаў аграэкасядзіб з 192 — да 209.

— Летась была праведзена вялікая работа па ўдасканаленні дзейнасці магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. На нядаўнім пасяджэнні ў Кіраўску эксперты Савета Еўропы ўхвалілі гэтыя дзеянні. Размова ішла пра тое, каб абраць вобласць для рэалізацыі пілотнага праекта па садзейнічанні актывізацыі развіцця асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў, павышэнне іх ролі і ўплыву на эканамічнае развіццё тэрыторыі.

— Так. Мы лічым, што на першым этапе максімальныя высілкі трэба накіраваць на навучанне дэпутацкага корпуса і нашых ініцыятыўных старастаў формам і метадам работы з насельніцтвам. Плануем правядзенне семінара-вучобы па рабоце мясцовых Саветаў дэпутатаў. Зробім гэта, хутчэй за ўсё, у выглядзе відэаканферэнцыі, каб ахапіць максімальную колькасць людзей.

Фінансавае пытанне плануем вырашаць за кошт пошуку і прыцягнення міжнародных грантаў тэхнічнай дапамогі. Грошы плануецца накіроўваць на развіццё Саветаў і органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, на павышэнне актыўнасці грамадзян у прыняцці рашэнняў мясцовага значэння. Мы ўжо падалі заяўкі на ўдзел у некалькіх грантах.

— На кантролі ў дэпутатаў цэлае кола пытанняў — ад рэалізацыі дзяржаўных праграм да канкрэтных праблем у той ці іншай галіне. Над якімі больш дэталёва працавалі дэпутаты летась?

— Напрыклад, камісія па аграрных пытаннях разглядала праблемы з кадрамі ў сельскай гаспадарцы. Размова ішла пра размеркаванне маладых спецыялістаў і іх замацаванне пасля вучэбных устаноў. Станоўчы прыклад па гэтай тэме — праект, рэалізаваны ў Дрыбінскім раёне, дзе на базе адной з навучальных устаноў збіраюць старшакласнікаў і рыхтуюць па запатрабаванай у райцэнтры прафесіі швачкі. За сродкі міжнароднай тэхнічнай дапамогі створаны вучэбны кабінет, цалкам абсталяваны сучаснай тэхнікай.

Размаўлялі таксама пра развіццё асабістых дапаможных гаспадарак. Тут сапраўды ёсць складанасці. У краіне існуюць высокія патрабаванні да якасці сыравіны, бо нашы прадпрыемствы працуюць на экспарт. Мы збіраемся больш дэталёва вывучыць гэтую праблематыку і выпрацаваць сістэмныя рашэнні на ўзроўні вобласці. Створана рабочая група па выпрацоўцы і ўнясенні прапаноў.

Летась стварылі ў абласным Савеце дэпутацкую групу грамадскай арганізацыі «Белая Русь», члены якой практыкуюць прыём выбаршчыкаў у грамадскіх прыёмных сумесна з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і прадстаўнікамі выканаўчай улады, каб комплексна разглядаць пытанні і адразу ж даваць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства.

— Летась у Магілёве прайшоў V Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, дзе ў дэпутатаў дзвюх краін была магчымасць устанавіць больш цесныя сувязі. З кім атрымалася пасябраваць і на якой стадыі вашы адносіны?

— Заключылі пяць пагадненняў з Самарскай і Смаленскай губернскімі Думамі, Калінінградскай абласной Думай, заканадаўчымі сходамі Краснадарскага краю, Калужскай вобласці. Зараз вядзём работу па напаўненні гэтых пагадненняў канкрэтнымі мерапрыемствамі. Атрымалі план узаемадзеяння з Краснадарскага краю. Расійскія калегі прапануюць правесці круглы стол на тэму захавання ўнікальных прыродных комплексаў, сумесныя семінары на канкрэтныя тэмы. Мы збіраемся ў найбліжэйшы час дапоўніць гэты план і пачаць яго рэалізоўваць. Нас цікавіць работа органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, механізм уцягвання насельніцтва ў рашэнне пытанняў мясцовага значэння.

— Вялікая ўвага ў краіне надаецца патрыятычнаму выхаванню моладзі. Маладзёжны парламент, па сутнасці, створаны для таго, каб уцягваць у грамадскую дзейнасць найбольш актыўных і перспектыўных маладых людзей.

— Так, у вобласці вядзецца работа па ўдасканальванні гэтага ўтварэння. Маладзёжныя парламенты існуюць у некалькіх нашых раёнах, плануем стварыць такое аб'яднанне і на ўзроўні вобласці. Але няма адзінай практыкі і шмат пытанняў. Зараз часцей за ўсё выбары праходзяць на базе школ, вучні вылучаюць свае праграмы, але ўзрост гэтых падлеткаў не заўсёды дапамагае ім раскрыцца. У той жа момант рабочая моладзь засталася па-за ўвагай. Трэба, каб прадстаўнікі ад яе таксама былі ў маладзёжным парламенце. Кожны з раёнаў павінен выбраць самых актыўных маладых людзей і дэлегаваць у абласны маладзёжны парламент. Плануецца, што будуць вылучэнцы таксама ад прафсаюзаў, іншых грамадскіх арганізацый. Трэба ахапіць усе сферы, усе кірункі.

> Мы ўскладаем вялікія спадзяванні на Саветы першаснага ўзроўню, на актывізацыю работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У вобласці створана 10 440 ОТГС, з іх 8540 аднаасобных, 1 900 — калегіяльных. Усяго ў органы грамадскага самакіравання было абрана 15 966 чалавек.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

МОЦНАЯ ЭКАНОМІКА — ГАЛОЎНЫ СКЛАДАЛЬНІК БЯСПЕКІ КРАІНЫ

Генеральны дырэктар «Магілёўліфтмаша» і сенатар Барыс Кавалеўскі пра пункты росту айчыннай прамысловасці

Перад краінай стаіць амбіцыйная задача павялічыць за пяцігодку ВУП удвая. Без перадавой высокатэхналагічнай прамысловасці зрабіць гэта праблематычна. «А каб яна была моцнай, трэба ўвесь час знаходзіцца ў стане мадэрнізацыі, — адзначае суразмоўнік. — Мы гэтага прынцыпу трымаемся няўхільна, нават калі з фінансамі цяжка. Свет зараз развіваецца апераджальнымі тэмпамі. На дзень прыпыніўся, адстаў, лічы, на гады».

— Я часта бываю за мяжой, як кіраўнік прадпрыемства і як член камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспекі Савета Рэспублікі, — кажа Барыс Віктаравіч. — Мне імпануе, што нашу краіну паўсюль асацыююць з якасцю. Нядаўна былі ў Азербайджане, дзе таксама рэалізуецца праграма замены ліфтаў, і было прыемна пачуць, як станоўча адгукаюцца аб нашых вырабах, і не толькі аб ліфтах, па сутнасці, аб усім — і прамысловых таварах, і прадуктах харчавання. Яны ведаюць, што ў нас захаваліся тыя патрабаванні, нарматыўныя дакументы, якія былі ў лепшыя часы. Нам пашчасціла, што ў краіне яшчэ з пасляваеннага часу ў кожным горадзе засталіся прадпрыемствы і лёгкай прамысловасці, і цяжкай. Сёння актуальна адно, заўтра другое. Горад, вобласць могуць аператыўна змяняць кірункі.

Мы таксама бачым, што тое абсталяванне, якое вырабляецца ў Германіі, Швейцарыі, Фінляндыі, Японіі, сёння найбольш надзейнае, з яго дапамогай можна рабіць больш якасныя рэчы. Нам, каб канкураваць з такімі сур'ёзнымі ліфтабудаўнічымі фірмамі як Otis, Kone, Thyssenkrupp, трэба мець перадавое абсталяванне. Дзесьці мы купляем яго за свае сродкі, дзесьці за крэдытныя. Яно дарагое, але бездакорна працуе і за перыяд эксплуатацыі цалкам акупляецца. Мы тым часам знаходзім нешта новае, яшчэ больш перадавое, бо свет, навука не стаяць на месцы. Гэта дазваляе нам знаходзіцца сярод лідараў.

Летась Барыс КАВАЛЕЎСКІ стаў лаўрэатам конкурсу «Чалавек сваёй справы — 2018» у намінацыі «За павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі» ў сферы прамысловасці».

— Падчас Пятага форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі на базе прадпрыемства працавала секцыя па лічбавай эканоміцы. Ці ёсць ужо нейкія вынікі ад той сустрэчы?

— Трэба адзначыць, што рыхтаваліся мы да мерапрыемства грунтоўна. Спікеры расійскага і беларускага парламентаў Валянціна Мацвіенка і Міхаіл Мясніковіч адзначылі, што праведзена яно было годна. Шэраг людзей, якія забяспечылі яго арганізацыю, быў заахвочаны. Што датычыцца вынікаў, то нічога так хутка не робіцца. Але супала, што мы падпісалі адзін з кантрактаў з нашым сумесным прадпрыемствам «Нижагародліфтмаш» на 500 мільёнаў рублёў. Гэта ліфты ў асноўным для замены ў жылых дамах Расійскай Федэрацыі. Ужо адгружана больш за 400 ліфтаў, а плануецца 1000—1500 па гэтым кантракце.

— З якімі праблемамі як да дэпутата да вас звяртаюцца людзі? Ці хапае часу на вырашэнне грамадскіх пытанняў?

— Часта прыходзіцца разглядаць жыллёвыя праблемы. Наогул шмат пытанняў па інтэрнатах. Людзі скардзяцца, што жывуць у малых пакойчыках. Нашы, напрыклад, інтэрнаты будаваліся 30 гадоў таму, калі нарматывы былі іншыя. На 2-3 чалавекі сёння патрэбна мінімум 12 «квадратаў», а ў нас 11,59. На аднаго чалавека гэта шмат, на дваіх мала. Але ж гэта не рашэнне пытання, да яго трэба, напэўна, падыходзіць творча. Знаходзім кампрамісы. Падымаў тэму на самым высокім узроўні, калі было сумеснае пасяджэнне верхняй і ніжняй палат з урадам.

Яшчэ адно набалелае пытанне — працаўладкаванне. Шмат хто да нас прыходзіць. Мы стараемся падтрымліваць дынастыі, але некаторыя звяртаюцца з вельмі далёкімі ад нашай спецыфікі прафесіямі, напрыклад музыкі. Прыходзіцца накіроўваць на перанавучанне.

З выбаршчыкамі рэгулярна працую і ў рамках Дня інфармавання, дзе спрабую як кіраўнік спалучаць абавязкі з дэпутацкімі. Падчас агляду нашай вытворчасці размаўляю з людзьмі, цікаўлюся іх клопатамі, плюс кожны чацвер вяду прыём па асабістых пытаннях. Удзельнічаю як сенатар Савета Рэспублікі ў розных мерапрыемствах, якія адбываюцца і ў горадзе, і ў вобласці. Там сустракаюся з прадстаўнікамі працоўных калектываў, грамадскасці, прыслухваюся да іх праблем, цікаўлюся, што перашкаджае іх вырашыць. Быць кіраўніком сямітысячнага калектыву і не жыць турботамі грамадства — гэта нерэальна.

Чатыры імгненні з жыцця вялікага прадпрыемства

Як магілёўскі ліфтавы гігант заваёўвае прэстыж на айчынным і замежным рынках

ЛІФТЫ прадпрыемства «Магілёўліфтмаш» сёння можна сустрэць дзе заўгодна. Нават у культавых будынках. Напрыклад, адзін такі манціруецца зараз у Бельгіі. Рухомыя вырабы прадпрыемства — ліфты, эскалатары, травалатары, гарызантальныя платформы і гэтак далей — можна сустрэць у самых нечаканых месцах, пачынаючы ад прыватных асабнякоў, заканчваючы метрапалітэнамі і атамнымі станцыямі.

Прадпрыемства вылучаецца сярод іншых за кошт таго, што яно адно з нямногіх у свеце збірае свае ліфты і ўвесь астатні асартымент з дэталяў і вузлоў выключна ўласнай вытворчасці. Яны вырабляюцца на чатырох пляцоўках холдынга — «Магілёўліфтмаш», «Электрарухавік» і «Зеніт» у Магілёве і «Ветразь» — у Віцебску. За час існавання суверэннай Беларусі «Магілёўліфтмаш» зрабіў неверагодны рывок наперад і акрамя адной, па сутнасці, мадэлі ліфта, якую штампаваў пры Савецкім Саюзе, асвоіў 130 розных — ад пасажырскіх і грузавых да бальнічных і катэджных.

Паход на Еўропу

Адзінкавыя мадэлі ліфтаў прадпрыемства туды ўжо пастаўляла, але цяпер мае намер канкураваць там разам з сусветна вядомымі брэндамі Otis, Kone, Schindler, прычым у прэміум класе. Летась для гэтага быў распрацаваны новы таварны знак Movel.

— Гэтая лінейка цалкам арыентаваная на Еўропу, — кажа **Сяргей БЫЧКОЎ, начальнік аддзела рэкламы і прасоўвання спажывецкіх тавараў ААТ «Магілёўліфтмаш».** — Для еўрапейца «Магілёўліфтмаш» цяжкавымоўнае слова. Мы зрабілі рэбрэндынг, каб у кліента былі больш прыемныя асацыяцыі з нашым таварам. Над стварэннем таварнага знака працавала сур'ёзная фірма, яна правяла цэлае даследаванне на прадмет успрымання гэтага слова. Сугучча гукаў павінна выклікаць у еўрапейца прыхільнасць. Знешне ліфт нічым не саступае еўрапейскім распрацоўкам.

Спецыяліст запрашае, як той казаў, адчуць розніцу і праехацца на прэстыжнай мадэлі. Сапраўды вельмі прыемна. Светлая і прасторная кабіна з вялікім люстэркам, падлога з натуральнага мармуру, мяккае асвятленне, з дынаміка гучыць заспакаяльная музыка — здаецца, ехаў бы і ехаў.

— Атрымалі сертыфікат для паставак у Еўропу, — каментуе спецыяліст. — У Польшчы ўжо ёсць свой дылер.

На выстаўку — у Маскву

Прадпрыемства — удзельнік шматлікіх выставак, здаецца, няма месяца, калі б спецыялісты куды-небудзь не выязджалі. Цяпер тут рыхтуюцца да чарговага мерапрыемства.

— З 26 да 28 чэрвеня ў Маскве пройдзе выстаўка Russian Elevator Week 2019 — самая галоўная для нас, там будуць прысутнічаць прадстаўнікі ліфтабудаўнічай галіны з Расіі, Турцыі, Італіі, Кітая, Германіі, Францыі і гэтак далей — усе сусветныя брэнды, — кажа Сяргей Бычкоў. — Туды ж прыязджаюць і так званыя дэвелаперы, якія займаюцца нерухомасцю, праектныя арганізацыі. Пазалетась прысутнічала 179 экспанентаў з 19 краін.

На выстаўку ў Маскву завадчане павязуць ліфтавыя кабіны на 400 і 1000 кілаграмаў. Гэта новыя ўзоры без машыннага памяшкання, са шкляной сцяной. Будзе прадстаўлена прадукцыя філіялаў холдынга — заводаў «Зеніт», «Электрарухавік» і «Ветразь». Гэта станцыі кіравання ліфтамі, шмат іншай інавацыйнай электронікі.

Патрэбныя пад'ёмнікі

Прадпрыемства перыядычна радуе спажыўцоў інавацыйнымі распрацоўкамі. Пад яго вокнамі зараз узвышаецца паркоўка ротарнага тыпу на 12 машына-месцаў, якую ліфтабудаўнікі прадэманстравалі грамадскасці сёлета ў студзені. Побач узводзіцца паркоўка шахтавага тыпу на 26 машына-месцаў вышынёй 36 метраў. У маі плануецца яе запуск. Побач яшчэ змантыруюць падземную на тры машына-месцы.

— Усе гэтыя паркоўкі будуць дзеючыя, людзі змогуць карыстацца і адначасова рэкламаваць нашы магчымасці, — кажа **генеральны дырэктар холдынга Барыс КАВАЛЕЎСКІ.** — У Беларусі і Расіі такое яшчэ ніхто не робіць, мы першыя.

Яшчэ адна інавацыйная распрацоўка — пад'ёмнік для басейна.

— Дослены ўзор ужо паставілі ў Палацы гімнастыкі ў Магілёве. Вельмі карыснае прыстасаванне для тых, хто мае праблемы з пазваночнікам, — удакладняе генеральны дырэктар.— Максімальная грузападъёмнасць да 120 кілаграмаў. Зроблена ўжо цэлая партыя. Разаслалі патэнцыйным заказчыкам свае камерцыйныя прапановы, рэкамендуем усім лячэбным установам, санаторыям, басейнам.

Вельмі зручнае прыстасаванне для стварэння безбар'ернага асяроддзя — пад'ёмнік для басейна.

Наогул, прадпрыемства распрацавала цэлую серыю розных ліфтаў і пад'ёмнікаў, якія могуць аблегчыць жыццё чалавеку з абмежаванымі магчымасцямі.

Ліфт у Сірыю

Нарматыўны тэрмін службы ліфта 25 гадоў, цяпер у Беларусі ідзе іх маштабная замена. Калі раней мянялі некалькі сотняў у год, то зараз некалькі тысяч.

— Замена ажыццяўляецца ў рамках «Камфортнае жыллё», — кажа **начальнік аддзела маркетынгу ААТ «Магілёўліфтмаш» Антон БЕЛЬСКІ.** — Але найбольш інтэнсіўна працэс пайшоў з сярэдзіны мінулага года. На сённяшні дзень замянілі ўжо 3000 ліфтаў. Людзі часта ацэньваюць вытворцу па тым, як працуе ліфт. Але тут шмат што залежыць ад якасці мантажу. Калі ён няякасны, гэта можа ўсё сапсаваць. У канструкцыю нашага ліфта штогод уносяцца карэктывы для зручнасці мантажу і павышэння яго эксплуатацыйных і спажывецкіх уласцівасцяў.

— Летась мы зрабілі 14 500 ліфтаў, прыкладна столькі завод выпускаў у 1990 годзе, але тады гэта была адна мадэль на дзве хуткасці, — кажа генеральны дырэктар прадпрыемства. — У параўнанні з пазалеташнім годам выпуск павялічылі на 2,5 тысячы ліфтаў. Будзем імкнуцца гэту планку захаваць і выйсці на 15 тысяч. Прадукцыя запатрабаваная, але прыходзіцца змагацца за кожны ліфт. Нават у Беларусь прыходзяць прадпрыемствы з Кітая, Карэі і Грэцыі, не кажучы пра Расію. У Еўропы свае асаблівасці, яна мала будуецца, да таго ж хоча, каб якасць была як у Otis, Kone, Schindler, а цана ніжэй плінтуса. Тым не менш адзінкавыя пастаўкі ёсць. Зараз спецыяльна для Сірыі распрацавалі ліфт на 1000 кілаграмаў пад'ёмам на вышыню 70 метраў для элеватара. Нядаўна паставілі першы ліфт у Нігерыю. Але рынак Расіі для нас прывабнейшы за астатнія, ён больш аб'ёмны, на ім можна зарабіць. Іншыя краіны не такія прыбытковыя, але мы імкнёмся захаваць сваю прысутнасць у розных рэгіёнах, а недзе яшчэ і нарасціць свае аб'ёмы. І такі падыход дазваляе нам адчуваць упэўненасць у заўтрашнім дні.

УНП 700008856

Матэрыялы падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.

Тэлесеткі

З НОВЫМ ГОДАМ

23 сакавіка споўніцца год, як у эфіры АНТ выходзіць суботні выпуск «Нашых навін».

У адрозненне ад інфармацыйных выпускаў у будні, тут інфармацыя падаецца ў больш лёгкім фармаце, а вядучая Вольга Сулімава, у якой некаторыя яшчэ пазнаюць колішнюю «Міс Мінск» Вольгу Курышку, выступае ў ролі не толькі чытальніцы навін, але і журналіста: знаходзіць герояў і тэмы для рэпартажаў, здымае сюжэты.

— Ці будзеце вы неяк адзначаць першую гадавіну праграмы, збіраць у студыі гасцей і прымаць віншаванні? — пацікавілася «Звязда» ў кіраўніка праекта Андрэя Мохара.

— Паколькі гаворка ідзе ўсё ж пра навіны, то ніякага вялікага святочнага шоу не плануем, як звычайна, пастараемся прапанаваць гледачам якасны, разнастайны і насычаны выпуск, але, безумоўна, пра дзень нараджэння праграмы згадаем і пэўныя «фішкі» рыхтуем.

Што да магчымых змяненняў і новых рубрык, то стваральнікі «Суботняга выпуску» запэўніваюць, што заўжды знаходзяцца ў творчым пошуку: «Мы не лічым, што персанальна ў нас з наступнага тыдня пачынаецца новы сезон, бо мы частка вялікай каманды АНТ, таму змяняемся і ўдасканальваемся разам з усім каналам».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Запрашальнік

НА ТЭМУ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

2 красавіка на сцэне Рэспубліканскага палаца культуры прафсаюзаў будзе прадстаўлена прэм'ера спектакля «Восем пачуццяў, або Нараджэнне чалавека».

Адметнасць пастаноўкі ў тым, што гэты праект міжнародны, зладжаны сумесна беларускім сямейным інклюзіўным тэатрам «і» і галандскім тэатрам Kazou пры цэнтры даследавання аўтызму. Спектакль, у якім заняты каля 80 прафесійных акцёраў і аматараў, будзе прадстаўлены ў фармаце васьмі ўзаемазвязаных навел, кожная з якіх прысвечаная пэўнаму пачуццю. Прыдумаў гэтыя кранальныя гісторыі адзін з выхаванцаў і акцёраў тэатра Кастусь Жыбуль. «Удзел у нашым спектаклі для дзяцей з аўтызмам мае значны «тэрапеўтычны» эфект: граючы пачуцці на сцэне, юныя акцёры вучацца лепш разумець уласныя эмоцыі — а гэта менавіта тое, чаго дзецям з асаблівасцямі светаўспрымання часам не стае, — адзначае **сцэнарыст і рэжысёр пастаноўкі, мастацкі кіраўнік сямейнага інклюзіўнага тэатра «і» Ірына ПУШКАРОВА.**

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 65

Сённяшняя задача ***(гл. дыяграму)*** належыць Аляксею Міронаву (1939—2001). Аляксей Фёдаравіч жыў у Магілёве, працаваў інжынерам. З сярэдзіны 50-х гадоў надрукаваў каля 150 задач, з якіх палова была адзначана ў конкурсах (у тым ліку 25 задач — прызамі). У чэмпіянатах Беларусі па кампазіцыі быў сярэбраным і тройчы бронзавым прызёрам.

Белыя: Крh1, Фd1, Лe8, Cd7, Cf4, пп. c3, d3, d4 (8).

Чорныя: Крd5, Ch4, Кc5, nf5 (4).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

***

На буйным традыцыйным турніры «Аэрафлот» у Маскве (101 удзельнік) Аляксей Аляксандраў, Уладзіслаў Кавалёў (мінулагодні пераможца) і Кірыл Ступак фінішавалі адпаведна на 38-м, 43-м і 65-м месцах. Там жа ў турніры «Б» Вольга Бадэлька — 27-я са 126. Вось адна з перамог беларусаў.

20.10 Сямейнае рабаванне (16+).
22.00 Шпіён па суседстве (12+).
23.55 Сёстры Магдалены (16+).
2.10 Чалавек — швейцарскі нож (18+).
4.05 Візантыя (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Са дна вяршыні (12+).
8.35 Усё пра мужчын (16+).
10.20 Паляўнічы-3. Забойства дэпутата (16+).
12.25 ЖАRA (16+).
14.30 Загадай жаданне (12+).
16.20, 4.20 Тры песні для Папялушкі. 1—2-я серыі (12+).
18.15 Дуэлянт (16+).
20.20 Лёгкі на ўспамін (12+).
22.00 Краіна глухіх (12+).
0.20 Паляўнічы-4. Адплата (16+).
2.25 Зязюля (16+).

National Geographic

0.25, 13.30 Асушыць акіян (16+).
1.15, 4.20, 9.30, 11.05 Дзікі тунец (16+).
2.00 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
2.50 Расследаванні авіякатастроф (16+).
3.35, 8.00, 15.50, 17.30, 21.20 Аўта-SOS (16+).
5.10 Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).
6.00 Гульні розуму (16+).
6.25 Супербудаванні (16+).
7.10 Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
10.20, 20.35 Інстынкт выжывання (16+).
12.40 Скарбы Тутанхамона: залаты фараон (16+).
14.15, 19.50 У пагоні за НЛА (16+).
15.00 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
18.15, 22.10 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
23.00 The Border (16+).
23.50 З гісторыі Другой сусветнай вайны (16+).

Discovery

8.00, 16.00, 22.00 Махінатары (12+).
9.00, 17.00, 23.00 Круты цюнінг (12+).
10.00, 15.00, 21.00 Як гэта ўстроена? (12+)
11.00, 20.00, 5.30 Паляўнічыя на старызну (12+).
12.00, 2.00, 7.10 Не спрабуйце паўтарыць (16+).
13.00 Разбуральнікі легенд (16+).
14.00, 4.40 НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
18.00 Аляска: сям'я з лесу (16+).
19.00, 2.55 Гаражны рамонт (16+).
0.00 Залатая ліхаманка (16+).
1.00, 6.20 Бітвы робатаў (16+).

ІНІЦЫЯТЫВА

СРОДАК АД ДЭПРЭСІІ

У Магілёўскай вобласці пяць раёнаў аб'ядналіся, каб разам займацца развіццём сваіх тэрыторый

Пілотны рэгіён — гэта Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі, Краснапольскі, Быхаўскі і Клічаўскі раёны. На тэрыторыі першых трох (яны найбольш пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС) чацвёрты год рэалізуецца праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці, створаная ў рамках Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 235. На жаль, тыя льготы і прэферэнцыі, якія гарантуе Указ, не вельмі ажывілі тут прадпрымальніцкую дзейнасць. Не лепшае эканамічнае становішча ў Быхаўскім і Клічаўскім раёнах. І пілотны праект, які стартаваў летась, якраз і разлічаны на тое, каб палепшыць становішча на тэрыторыі раёнаў. Стаўка робіцца на прыцягненне сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі і задзейнічанне актыўнага насельніцтва.

У кожнага раёна ёсць вопыт работы з грантамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Слаўгарад уключыўся ў гэтую дзейнасць з 2007 года. Мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра» рэалізаваў за гэты час 21 праект. Тры з іх дапаможуць адрадзіць традыцыі сыраробства ў раёне і нават стварыць адпаведны фестываль. Слаўгарадскі філіял грамадскага аб'яднання «Сяльчанка» даў магчымасць знайсці сваю справу найбольш актыўным жыхарам раёна і ўвасобіў у жыццё два буйныя праекты. Яшчэ чатыры на рахунку спажывецкага кааператыва «Гіжэнскі аграрый» — усе яны маюць адносіны да добраўпарадкавання і арганізацыі самазанятасці грамадзян.

У 2015 годзе аналагічны фонд развіцця сельскіх тэрыторый пад назвай «Старт-Узыход» адкрыўся ў Краснаполлі. На яго рахунку пяць сацыяльна важных праектаў. З іх дапамогай атрымалася захаваць цудоўны помнік прыроды мясцовага значэння — батанічны сад «Іваноў хутар», арганізаваць відэашколу для перспектыўнага бізнесу, аб'яднаць насельніцтва для сумеснага вырошчвання гародніны, стварыць у вёсцы Яноўка хакейную сталіцу раёна і падтрымаць вяскоўцаў у іх жаданні займацца садоўніцтвам.

Над рэалізацыяй праектаў працуе мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый Быхаўскага раёна, які адкрыўся каля двух гадоў таму.

Усе гэтыя некамерцыйныя арганізацыі паспяхова супрацоўнічаюць з органамі ўлады ў сферы занятасці і самазанятасці насельніцтва, займаюцца вырашэннем экалагічных і сацыяльных праблем. Па абагульненых звестках, за 2018 год імі прыцягнута і асвоена каля 500 000 еўра, выдзеленых па лініі Еўрапейскага саюза, ПРААН і іншых міжнародных арганізацый. Сродкі дапаможуць рэалізаваць шмат вельмі неабходных і важных для раёнаў праектаў. У аграрадку Лабанаўка Чэрыкаўскага раёна адкрыўся школьны энергапарк, у Краснаполлі — рэсурсны цэнтр «Энергазберажэнне ў побыце», у Быхаве — «Дом-інтэрнат з нулявымі стратамі энергіі», пры Клічаўскім аграрна-тэхнічным каледжы створаны клас энергаэфектыўнасці. Але такіх рэсурсных цэнтраў не хапае, каб здзейсніць рэвалюцыю ў эканоміцы. Таму і спатрэбілася аб'яднаць высілкі. А заадно больш зладжана працаваць па некалькіх асноўных кірунках. Напрыклад, у моладзі ёсць магчымасць праявіць сябе ў крэатыўнай эканоміцы. Гэта ўсё, што звязана з творчасцю, ІТ-тэхналогіямі, арганізацыяй свят. За апошнія паўтара года ў пяці раёнах створана сем пілотных мадэляў крэатыўных відаў дзейнасці, каля 10 спецыялістаў у кожным раёне працуюць над папулярызацыяй гэтага віду бізнесу, у рэгіён прыцягнута не менш за тры мільёны долараў ЗША. Вельмі перспектыўны турыстычны кірунак. У Слаўгарадскім раёне размешчаны водна-балотны заказнік «Слаўгарадскі», у Клічаўскім — два заказнікі — гідралагічны «Астравы Дулебы» і біялагічны «Свіслацка-Бярэзінскі», у Быхаўскім — ландшафтны заказнік «Старыца». І тут таксама ёсць над чым працаваць.

— Навізна праекта заключаецца ў тым, што ўпершыню ў Беларусі прадугледжваецца ўзаемадзеянне паміж раёнамі ў фармаце мадэльных рэгіянальных праектаў, дзе кожны раён адыгрывае сваю ўнікальную ролю, падае свае рэсурсы, як для сумесных дзеянняў у інтарэсах усяго рэгіёна, так і кожнага раёна паасобку, — кажа **старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў, а па сумяшчальніцтве яшчэ і старшыня каардынацыйнага савета рэгіянальнага праекта Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Такое ўзаемадзеянне дапаможа нам палепшыць занятасць насельніцтва ў сельскай мясцовасці. А на тэрыторыі пяці раёнаў сёння пражывае больш за 80 тысяч чалавек. Падчас падрыхтоўкі праекта было створана 20 мікрарэгіёнаў, для развіцця якіх распрацоўваюцца 60 ініцыятыў. Ёсць спадзяванні, што 20 будуць падтрыманыя праектам, а на рэалізацыю астатніх пойдуць унутраныя рэсурсы і спонсарскія сродкі. Абноўлены анлайн-сэрвіс і створана смарт-праграма ў выглядзе лічбавай карты для прасоўвання канкурэнтных пераваг рэгіёна. Сфарміраваныя тэматычныя сеткі — сельскі турызм, арганічнае земляробства, саветы вёсак. Распрацаваны тры буйныя праекты ў супрацоўніцтве з міжнароднымі партнёрамі, для 1500 чалавек створаны ўмовы для павышэння самазанятасці ў рэгіёне.

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў:

— Пяць раёнаў, якія маюць складаную эканамічную абстаноўку, цяжкасці са сваім развіццём, аб'ядналіся для сумеснага рашэння сваіх ініцыятыў з прыцягненнем грантаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Такі саюз дапамагае кансалідаваць вопыт і веды некалькіх раёнаў і разам выступаць. Гэта дасць магчымасць прыцягнуць больш значныя фінансавыя рэсурсы і стварыць дадатковыя магчымасці для развіцця рэгіёнаў. Актыўна прымаюць у гэтым удзел народныя выбраннікі, раённыя Саветы дэпутатаў.

ВЕДАЙ НАШЫХ

ТУРЫСТ ВЫБІРАЕ... ДЫЕТУ?

Як былая дэпутатка ўзначаліла санаторый і забяспечыла ў Кіраўскім раёне выкананне паказчыка па экспарце турыстычных паслуг

Для любой краіны турысты — гэта дадатковы капітал, магчымасць развіцця канкрэтнай тэрыторыі. Бязвізавы рэжым робіць падарожжа ў Беларусь больш прывабным. На жаль, госці асядаюць у асноўным у буйных гарадах, дзе ёсць што паглядзець, куды схадзіць. Але і на перыферыі таксама пачынаюць набіраць абароты.

Напрыклад, летась Кіраўскі раён выканаў паказчык па экспарце турыстычных паслуг менавіта за кошт санаторыя. Цікава, што ўстанова з'яўляецца структурным падраздзяленнем ААТ «Світанак» імя К. Арлоўскага. А кіраўнік санаторыя, як той казаў, наш чалавек — вопытны **дэпутат і намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях у мінулым Вольга ГАРШКОВА *(на фота)***. Дарэчы, свае абавязкі начальніка аздараўленчай установы яна паспяхова спалучае са старшынёўствам у раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Фонд міру». І гэта толькі станоўча адбіваецца на яе асноўнай дзейнасці. Што патрэбна турысту? Нешта ўбачыць, захапіцца і пажадаць вярнуцца. І кіраўніца добра ведае як гэта арганізаваць. Тым, хто ў гэтым бізнесе, напэўна, будзе карысна даведацца як.

— Мы наогул выгадна адрозніваемся ад іншых, бо маем цікавую гісторыю ўзнікнення, — кажа Вольга Гаршкова. — Наш санаторый, напэўна, адзіны ў Беларусі з'яўляецца структурным падраздзяленнем аграгаспадаркі. Яго будаваў для сваіх работнікаў легендарны Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы Кірыла Пракопавіч Арлоўскі, той самы, пра якога зняты фільм «Старшыня» з Міхаілам Ульянавым у галоўнай ролі. Незвычайны быў чалавек, прафесіянал. Другі корпус, дзе цяпер знаходзяцца ўсе асноўныя памяшканні санаторыя, узводзіў яшчэ адзін наш таленавіты кіраўнік Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў. Месцазнаходжанне санаторыя таксама знакавае. У XIX стагоддзі гэта быў цэнтр маёнтка, які належаў фон Гоеру. Захавалася нават яшчэ панская алея, дзе гуляюць нашы адпачывальнікі. За некалькі кіламетраў Жылічы, дзе знаходзіцца палац вядомых беларускіх магнатаў Булгакаў — там зараз ідзе рэканструкцыя. Але паглядзець ёсць што, і мы возім туды турыстаў. А яшчэ ў Мінск, Магілёў і Бабруйск. Але ж мы санаторый, і перш за ўсё і змагаемся за тое, каб кліент атрымаў поўны пералік паслуг, якіх сёння шмат.

Вельмі падабаецца людзям камернасць санаторыя — ён невялічкі, разлічаны ўсяго на 66 месцаў. У планах рэканструкцыя корпуса, які будаваў яшчэ Кірыла Арлоўскі. Плануецца зрабіць там ВІП-нумары і нумары для інвалідаў-калясачнікаў. Дабавіцца яшчэ каля 40 месцаў.

Здраўніца стала папулярнай у замежных турыстаў у 2013 годзе, пасля таго як прадстаўнікі санаторыя пабывалі на выстаўках і турыстычных кірмашах у Маскве, Санкт-Пецярбургу. Сёння тут прымаюць кліентаў з гэтых гарадоў, а таксама з Мурманска, Геленджыка, Ніжневартаўска, Ленінградскай вобласці і іншых. Сюды едуць турысты з Украіны, Германіі, Італіі, Казахстана, Эстоніі, Літвы, Латвіі.

— Мы шчыльна працуем з турыстычнымі фірмамі, расійскіх у спісе каля дванаццаці, — удакладняе суразмоўніца. — Летась больш за 50 % нашых гасцей прыехала з-за мяжы. Але мы захоўваем сваю прыналежнасць і не крыўдзім асноўнага нашага кліента — аграрніка. У снежні адпачывала група кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў. Яны тут і аздараўляліся, і вучыліся — да іх прыязджалі чытаць лекцыі з Мінска, Беларускай сельгасакадэміі з Горак. Потым прыехалі адпачыць механізатары. У іх работа напружаная — і органы дыхання пакутуюць, і пазваночнік. А гэта якраз наш профіль. Падаграваем цікавасць тым, што прапануем нешта новае. Летась, напрыклад, пачалі практыкаваць так званае лячэбнае галаданне. Сёння гэта наша асаблівасць і запатрабаваная паслуга.

— Зараз мала дзе такое прапануюць, — удакладняе **намеснік начальніка па медыцынскай частцы санаторыя Уладзімір КАВАЛЕЎСКІ.** — Афіцыяльна паслуга называецца разгрузачная дыетычная тэрапія. Ёсць людзі, якія жадаюць схуднець, але дома ў іх нічога не атрымліваецца. Нядаўна былі госці з Прыбалтыкі, а да гэтага прыязджалі кліенты з Гродна, Мінска, Еўпаторыі, Ізраіля, ЗША. Наша справа толькі трымаць марку і арыентавацца на попыт.



Вадзім БРЭЖЭЗІНСКІ, начальнік аддзела вучэбна-спартыўнай, арганізацыйнай і турыстычнай работы ўпраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама:

— Сёння на тэрыторыі Магілёўскай вобласці функцыянуе 56 гасцініц і аналагічных пляцовак размяшчэння, 21 дом паляўнічага і рыбалова, 209 суб'ектаў аграэкатурызму, 27 баз адпачынку, 236 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, дзевяць санаторна-аздараўленчых устаноў, тры кемперныя пляцоўкі.

Варта адзначыць, што 89 % усяго экспарту турыстычных паслуг вобласці прыпадае на Бабруйск, Магілёў, а таксама Круглянскі, Кіраўскі і Горацкі раёны. Астатнімі васямнаццаццю раёнамі вобласці паказчык выконваецца толькі на 11 %. За апошнія пяць гадоў унёсак раёнаў у экспарт вырас. Калі ў 2012-м Магілёў і Бабруйск давалі 90 % экспарту, то цяпер — 75 %. Сярод асноўных валаўтваральных прадпрыемстваў вобласці значыцца і санаторый ААТ «Світанак» імя К. Арлоўскага.

Матэрыялы падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.

УСТОЙЛІВАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ, ПРЫГОЖЫЯ ТЭРЫТОРЫІ, ЗАДАВОЛЕНЫЯ ЛЮДЗІ...

У гэтым бачыць сваё прызначэнне дэпутат і генеральны дырэктар прадпрыемства «Магілёўаблгаз» Аляксей КУШНАРЭНКА

Улічваючы тое, што не ўсе мелі магчымасць прайсціся па тэрыторыі прадпрыемства, даю справаздачу. Такі бездакорны парадак і насычанасць высокатэхналагічным абсталяваннем можна пабачыць не ўсюды. Нездарма прадпрыемства лічыцца ў вобласці адным з перадавых, яго назву можна знайсці на Дошцы гонару Кастрычніцкага раёна Магілёва. Але Аляксея Кушнарэнку ведаюць не толькі як моцнага кіраўніка, ён яшчэ і добрасумленны дэпутат. Вось ужо другое скліканне запар ён перавыбіраецца ў абласны Савет дэпутатаў. Пад яго адказнасцю знаходзіцца амаль 16 тысяч чалавек — 2400, якія працуюць непасрэдна пад яго кіраўніцтвам у сістэме «Магілёўаблгаз», плюс 13417 выбаршчыкаў ад Алтайскай выбарчай акругі № 39 Кастрычніцкага раёна Магілёва. У размове з карэспандэнтам «МС» Аляксей Кушнарэнка расказаў пра...

РАБОТУ З НАСЕЛЬНІЦТВАМ

— Дэпутацкая работа перш за ўсё для мяне грамадзянская пазіцыя. Калі ёсць давер, я ўсё зраблю, каб яго апраўдаць. Пры гэтым я разумею, што маё прафесійнае становішча дапамагае мне вырашаць тыя ці іншыя пытанні, бо я ў сваёй дзейнасці сутыкаюся з кіраўнікамі рознага ўзроўню, розных галін, сфер і гэта дазваляе мне быць карысным людзям. Вельмі актуальная сёння тэма — навядзенне парадку на зямлі, добраўпарадкаванне двароў. Я бяру па магчымасці самы дрэнны двор у сваёй акрузе, спецыяльна аб'язджаю тэрыторыю, каб знайсці такі, і разам з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, дарэчы, вельмі часта з моладдзю ад БРСМ, прыводзім яго ў парадак. Сваімі рукамі зрабілі дзіцячую пляцоўку па бульвары Непакараных, 71—73, яшчэ дзве — па Сіманава, 29а і 45 — прывялі ў парадак.

У аблсавеце я ўзначальваю Пастаянную камісію па прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, сувязі, жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадарцы, у якую ўваходзіць 11 чалавек. Дык вось, гэтую ініцыятыву з добраўпарадкаваннем двароў мы разгледзелі на нашай камісіі, і дэпутаты аднагалосна яе падтрымалі. Сёлета кожны прадстаўнік нашай камісіі ў сваёй выбарчай акрузе абярэ двор і навядзе там парадак.

ДЭПУТАЦКУЮ ВУЧОБУ

— Летась мы правялі шэраг выязных пасяджэнняў, дзе на прыкладзе канкрэтных арганізацый і прадпрыемстваў паказвалі перадавыя падыходы ў рабоце. Напрыклад, на базе СЭЗ «Магілёў» размова ішла аб стварэнні сучасных прадпрыемстваў, новых рабочых месцаў. Што датычыцца сферы паслуг, то такое пасяджэнне адбылося на базе нашага прадпрыемства «Магілёўаблгаз». Наша асноўная задача — бесперабойная і безаварыйная падача блакітнага паліва спажыўцам вобласці. У сваёй рабоце па максімуме выкарыстоўваем перадавыя тэхналогіі. Паказалі дэпутатам наш сэрвісны цэнтр, праграмы, з якімі працуем, аснашчанасць работнікаў газавай службы, якія кантактуюць непасрэдна з насельніцтвам, мабільнымі прыстасаваннямі і відэарэгістратарамі. Па выніках сустрэчы падрыхтавалі даведачную інфармацыю і даслалі яе ва ўсе раённыя і гарадскія выканкамы, а таксама мясцовыя Саветы дэпутатаў і арганізацыі, якія аказваюць паслугі насельніцтву.

КАДРЫ І СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

— Шмат увагі аддаецца павышэнню кваліфікацыі нашых спецыялістаў, адукацыйнаму ўзроўню, магчымасці самавыяўлення праз грамадскія аб'яднанні, прафсаюзны камітэт. 70 чалавек завочна абучаецца ў вышэйшых навучальных установах, пяць з іх атрымліваюць веды ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце. Ёсць свой тэхнічны клас, дзе супрацоўнікі пастаянна павышаюць кваліфікацыю. Не дзіўна, што потым яны дэманструюць высокі прафесіяналізм на адпаведных спаборніцтвах на ўзроўні краіны. Летась мы сталі пераможцамі ў трох рэспубліканскіх конкурсах з чатырох. Па выніках работы за мінулы год «Магілёўаблгаз» стаў найлепшым у сістэме «Белпалівагаз» па ахове працы. А пяць нашых супрацоўнікаў атрымалі найвышэйшыя ўзнагароды — медаль «За працоўныя заслугі». Мы актыўна працуем з насельніцтвам, наш дэвіз — мы для людзей, а не людзі для нас. Сёння кожны ахвотны можа на нашым сайце зарэгістраваць свой асабісты кабінет і атрымліваць усю неабходную інфармацыю — тэхнічную, эканамічную, прававую. У нас ужо 1400 такіх абанентаў. Летась на нашым сайце пачаў працаваць онлайн-кансультант, і абанент можа ў рэжыме рэальнага часу задаць спецыялісту тое ці іншае пытанне. Штомесяц мы даём больш як 80 такіх адказаў.

ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

— Сам з'яўляюся прыхільнікам здаровага ладу жыцця і паўсюль гэта прапагандую — і на прадпрыемстве і ў сваёй выбарчай акрузе. У маёй акрузе дзве школы — 13-я і 38-я. Штогод праводжу дэпутацкі турнір паміж дзвюма школамі. Сёлета правялі спаборніцтвы па міні-футболе, дзеці з задавальненнем дэманстравалі свае спартыўныя навыкі.

БЯСПЕКА ПЕРШ ЗА ЎСЁ

На сённяшні дзень на абслугоўванні «Магілёўаблгаза» знаходзіцца 430 тысяч газіфікаваных кватэр і індывідуальных жылых памяшканняў, 7 тысяч кіламетраў газавых сетак, уся асноўная прамысловасць вобласці, а гэта — 560 арганізацый і прадпрыемстваў. У Магілёўскай вобласці газіфікавана 334 населеныя пункты, з якіх 136 — аграгарадкі. Такая вялікая гаспадарка абавязвае трымаць руку на пульсе і рабіць усё для таго, каб сістэма дзейнічала бесперапынна і без аварый.

Абслугоўванне ў рэжыме анлайн

Аварыйна-дыспетчарская служба «Магілёўаблгаза» — наглядны прыклад таго, як працуе прадпрыемства. З дапамогай тэлеметрычнай сістэмы ў анлайн-рэжыме арганізаваны кантроль за ўсімі газаразмеркавальнымі аб'ектамі і сеткамі газазабеспячэння ў Магілёўскай вобласці. Пры парушэнні работы спрацоўвае сігнал трывогі і на працягу пяці хвілін на месца здарэння адпраўляецца найбліжэйшая да яго «аварыйка». Па сутнасці, пад кантролем усё газавае абсталяванне вобласці. База для праграмнага забеспячэння «Панарама» складалася некалькі гадоў, і цяпер па кожнай пліце (або любой іншай адзінцы газавага абсталявання) сабраная такая вычарпальная інфармацыя, як у паліклініцы пра пацыента. Мне хаваць няма чаго, прапанавала навесці даведкі пра сябе. І нават не чакала ў лічаныя хвіліны атрымаць такую падрабязную справаздачу. Год выпуску пліты, яе марка, аплата за паслугі — гэта зразумела, але мне расказалі яшчэ і пра рамонт майго газавага абсталявання пяцігадовай даўніны, колькі гэта мне каштавала і хто канкрэтна ім займаўся. Наогул, перадавыя тэхналогіі магілёўскія газавікі выкарыстоўваюць на кожным кроку. Усе машыны абсталяваны GPS-навігатарамі, і можна адсочваць, дзе знаходзіцца аўтамабіль у пэўны момант, сістэма таксама раскажа, дзе ён прыпыняўся і па якім маршруце рухаўся на працягу дня. Па заяўках ад насельніцтва слесары ходзяць з планшэтамі і ўсе ўзаемаадносіны з абанентамі фіксуюць выключна ў электронным выглядзе. Апошнім часам яны бяруць з сабой яшчэ і відэарэгістратары. Гэта гарантуе якасць абслугоўвання канкрэтнага кліента. Дарэчы, пры «Магілёўаблгазе» працуе свой IT-аддзел, які займаецца распрацоўкай як сваіх праграмных прадуктаў, так і абслугоўваннем запазычаных.

Генеральны дырэктар пазіцыянуе сваё прадпрыемства як вулей з сотамі.

Гэта павінен ведаць кожны

Супрацоўнікі газавай службы гарантуюць нам безаварыйную і бесперабойную падачу блакітнага паліва, але бяспека — гэта справа кожнага, хто карыстаецца газавым абсталяваннем. І трэба не забывацца пра тое, што яно перыядычна павінна праходзіць тэхнічны агляд. Тэхнічнае абслугоўванне катлоў і сезонна працуючых апаратаў ажыццяўляецца адзін раз на год. А тэхнічнае абслугоўванне газавых пліт пры правядзенні поўнага тэхабслугоўвання запорных прылад на газаправодах-уводах і ўнутраных газаправодах, уводных газаправодаў і газавага абсталявання з адключэннем ад газаразмеркавальнай сістэмы і выпрабаваннем на герметычнасць паветра — адзін раз на 10 гадоў; без адключэння ад газаразмеркавальнай сістэмы — першы раз праз пяць гадоў пасля ўводу ў эксплуатацыю, наступныя — праз 10 гадоў.

Да ведама насельніцтва, сярэдні тэрмін службы газавых пліт складае 10—12 гадоў, водананагравальных праточных газавых і ацяпляльных апаратаў — 12 гадоў. Падоўжыць тэрмін службы можна толькі пасля агляду яго спецыялістам. Для гэтага трэба заключыць дамову з газазабеспячальнай арганізацыяй.

Што датычыцца дымавых і вентыляцыйных каналаў, то іх праверка і прачыстка праводзіцца спецыялізаванымі арганізацыямі з афармленнем адмысловага акта. Спажыўцы прыватных домаўладанняў могуць рабіць гэта самастойна пасля праходжання спецыяльнага абучэння і атрымання допуску да выканання такіх работ. У шматпавярховіках гэтым звычайна займаецца арганізацыя, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду. Няспраўныя дымавыя каналы — гэта просты шлях да трагедыі. Бо чадны газ не мае ні колеру, ні паху. Выратаваць ад няшчасця могуць спецыяльныя сігналізатары чаднага газу. Пры аварыі яны тут жа пададуць гукавы сігнал.

Быць бліжэй для кліента

Прадпрыемства паклапацілася, каб сэрвісны цэнтр абслугоўвання насельніцтва размяшчаўся ў найбольш зручным для спажыўцоў месцы Магілёва — па вуліцы Гагарына, 83. Тут спецыялісты працуюць непасрэдна з наведвальнікамі. А нядаўна на базе гэтай службы пачаў працаваць яшчэ і кол-цэнтр. На тэлефоннай сувязі з жыхарамі вобласці тут працуюць адразу пяць аператараў. Па кантактных тэлефонах 129 і 711000 сюды паступае штодзённа да тысячы званкоў. Прымаюцца заяўкі на дастаўку балонаў са звадкаваным газам, мантаж-дэмантаж газавага абсталявання, даюцца кансультацыі па газіфікацыі прыватных дамоў, тлумачыцца парадак разлікаў за газ.

— А нядаўна мы ўкаранілі тэрміналы, каб кліентам было прасцей разлічвацца за нашы паслугі, — кажа **генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксей КУШНАРЭНКА.** — Пачыналі са Шклоўскага раёна і не прагадалі. Эксперымент прайшоў паспяхова, і зараз гэтую практыку мы ўкараняем паўсюдна. Наша задача — жыць турботамі кліента. Гэта мяне яшчэ і як дэпутата хвалюе.

УНП 700010367

Матэрыялы падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.

МАТЫВАВАЦЬ АГРАРЫЯ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Якаў Усцінавіч, у чым асабіста вы бачыце праблему з кадрамі? Як яе можна вырашыць у сённяшніх умовах?

— Чалавекам рухае цікавасць, і дзеянні яго заўсёды матываваныя. А інтарэс заключаецца не ў разуменні асноў той ці іншай спецыяльнасці, а ў задавальненні элементарных жыццёвых патрэб. Гэта яшчэ да Маркса было вядома, але ён выразна ўсё сфармуляваў у сваёй тэорыі — адзенне, ежа і жыллё. Калі гэтыя тры асноватворныя элементы прысутнічаюць, чалавек будзе працаваць. У нас жа ўсё на сённяшні дзень упіраецца ў заработную плату. Калі параўноўваць, у сферы ІТ-тэхналогій, напрыклад, атрымліваюць 2,5— 3 тысячы долараў, а малады спецыяліст у сельскай гаспадарцы ў лепшым выпадку 150 долараў у эквіваленце. Галіна сельскай гаспадаркі ў адносінах да іншых сёння знаходзіцца на адным з апошніх месцаў па ўзроўні заработнай платы. Прадукцыя прамысловасці расце ў цане больш значнымі тэмпамі, чым паднімаецца кошт прадукцыі сельскай гаспадаркі. І калі браць сыравіну, паліва, запчасткі, сельгаспрадукцыя атрымліваецца дарагой. Рэалізоўваць яе трэба па сацыяльна-абгрунтаваных цэнах, таму рэальная вытворчасць практычна не мае прыбытку. Няма магчымасці развівацца, падымаць заработную плату. І малады чалавек гэта ведае. Ён, у адрозненне ад таго, якім быў 20—30 гадоў таму, жыве зараз у іншым інфармацыйным полі. Ён ведае, дзе і як можна зарабіць.

— Але ж ёсць прыклады паспяховай дзейнасці некаторых фермерскіх гаспадарак. Магчыма, будучае сельскай гаспадаркі менавіта за прыватнай уласнасцю?

— На жаль, мы з вамі на гэта паўплываць не можам. У нас у асноўным грамадская форма вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, большая частка гаспадарак знаходзіцца ў камунальнай форме маёмасці. Па сутнасці, гэта былыя савецкія гаспадаркі. Трэба паступова іх рэфармаваць. Калі мы жадаем атрымаць годныя сельгаспрадпрыемствы, павінны ў гэта ўкладваць грошы. Патрэбны капітал, і вельмі вялікі, каб перааснасціць вытворчасць, каб былі новыя тэхналогіі, каб зацікавіць людзей. А як гэта зрабіць, калі крэдыты пад 18—20 %? Яны непад'ёмныя.

— Як вы ставіцеся да таго, што ў краіне шмат аграрных вышэйшых навучальных устаноў, не кажучы ўжо пра каледжы, а кадраў не хапае.

— Сапраўды, устаноў шмат, вось гэта і дрэнна, бо рэгіянальныя інтарэсы прывялі да таго, што мы распыліліся ў падрыхтоўцы кадраў і ўзровень атрымаўся вельмі нізкі. Сёння, калі ў сталічную ВНУ абітурыент не паступіў, ён ідзе ў аграрную, дзе недабор. Гэта ж не забараняецца. Маладыя людзі запаўняюць свабодныя месцы, каб потым так-сяк праіснаваць пяць гадоў, атрымаць дыплом і — не працаваць. А была б адна ВНУ і конкурс быў бы. Калі я паступаў у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію на факультэт механізацыі, на адно месца прэтэндавалі чатыры чалавекі, а да мяне, кажуць, і ўсе 8-9. Мы паступалі матываванa, рыхтаваліся спецыяльна. А сёння такога няма. Трэба неадкладна падключыць сацыёлагаў, каб яны сказалі, колькі сярод студэнтаў аграрных ВНУ матываванага кантынгенту. Сёння нашы кадры працуюць і ў МНС, і ў міліцыі, толькі не ў сельскай гаспадарцы. Там рэгламентаваныя і зарплата, і працоўны дзень. А ў сельскай гаспадарцы прыйшоў на работу — і можаш «завіснуць» на суткі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Яшчэ адна праблема, пра якую сёння трэба казаць, гэта няправільная прапорцыя паміж кадрамі з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і кадрамі масавых прафесій. У Англіі, напрыклад, 16 % работнікаў маюць вышэйшую адукацыю, астатнія — кадры масавых прафесій. У Паўднёвай Карэі таксама. А ў нас кадраў масавых прафесій усяго 24 %, астатнія — з вышэйшай адукацыяй. Трэба неадкладна паніжаць іх колькасць, паколькі 50 % з іх не працуюць па спецыяльнасці.

— Міністэрства адукацыі вырашыла на базе асобных школ арганізаваць агракласы. Наколькі гэта выратуе становішча?

— Гэта вельмі правільны крок. Трэба будучаму аграрніку даваць зачаткі новых тэхналогій, асноў сельскай гаспадаркі. І ў аграрных класах трэба казаць не толькі пра гэта, неабходна і філасофскі складнік дадаць, каб дзеці разумелі, наколькі гэта важна. А вось з тым, што такі выпускнік зможа ісці ў аграрную ВНУ без экзаменаў, не згодны. Нейкія іспыты павінны быць, каб чалавек адчуваў, што павінен рыхтавацца.

— Сёння паўсюль укараняюцца інавацыйныя тэхналогіі, і сельская гаспадарка не выключэнне. Ці ёсць праблемы ў прывіцці інавацыйнага мыслення сённяшнім работнікам АПК?

— Складанасці, сапраўды, ёсць. Тэхналогіі развіваюцца вельмі хуткімі тэмпамі, і маладому спецыялісту трэба ўвесь час знаходзіцца ў стадыі абучэння. Тут нават з рабочай спецыяльнасцю трэба мець высокі ўзровень ведаў. Таму тэма дадатковай адукацыі спецыялістаў існуе паўсюль. Пытанне вось у чым. Можна запрасіць на вучобу і нешта расказваць. Але кітайская парадыгма адукацыі гучыць такім чынам: раскажы мне, і я забуду, пакажы мне, і я запомню, дай мне гэта зрабіць, і гэта застанецца са мной назаўсёды. Там, дзе справа датычыцца павышэння кваліфікацыі, патрэбна практычная адпрацоўка новых прыёмаў і тэхналогій. Неабходна, каб лекцыйны курс складаў 20—30 % ад агульнага аб'ёму гадзін, астатняе павінна быць практыкай работы на новай тэхніцы, з новымі прэпаратамі. На Захадзе даўно карыстаюцца трэнажорамі-сімулятарамі, слухач садзіцца за камп'ютар і пачынае кіраваць. Такім чынам чалавек адпрацоўвае валоданне функцыямі. У нас ніводнае прадпрыемства ў краіне не робіць такіх трэнажораў.

— А ці можа наша сельская гаспадарка сама зарабляць, без дапамогі дзяржавы?

— Кітайцы кажуць, калі ў вас няма чым карміць сабаку, адпусціце яго. Сельская гаспадарка была і будзе столькі, колькі будзе існаваць чалавецтва. І маманта чалавек біў, аб'ядноўваючыся ў вялікія групы, таму што есці хацеў. Няма альтэрнатывы сельскай гаспадарцы. Звярніце ўвагу на наш Столінскі раён. Там ужо ўсе сёння людзі як мурашы сядзяць у цяпліцах, а праз некалькі тыдняў будуць прадаваць агуркі і клубніцы. Значыць, можна зарабіць. Ёсць у сельскай гаспадарцы сферы прыкладання, якія карыстаюцца попытам. Але для гэтага павінна быць асабістая свабода, каб можна было прымаць рашэнне.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Аксана АГАРОДНІКАВА, старшыня Горацкага райсавета дэпутатаў:

— Кадры для АПК рыхтуюцца ў раёне яшчэ на школьным узроўні, каб дзеці падыходзілі да гэтага свядома. На базе школ арганізавана навучанне па профілі «трактарная справа», каб моладзь мела магчымасць асвоіць рабочую прафесію яшчэ да таго, як пачне дарослае жыццё. У чатырох школах арганізаваны сельскія класы, дзе падчас факультатыўных заняткаў абмяркоўваюцца тэмы сельскагаспадарчай тэматыкі. На базе горацкай сярэдняй школы № 2 працуе малая акадэмія, якая трымае цесныя сувязі з Беларускай сельскагаспадарчай акадэміяй. Там вядзецца паглыбленае вывучэнне хіміі і біялогіі, прадметаў, неабходных для ветэрынарнай справы.

Нам, дэпутатам, па родзе сваёй дзейнасці даводзіцца пастаянна займацца кадрамі. Наша камісія па садзейнічанні занятасці працуе з насельніцтвам вельмі цесна, тлумачым, накіроўваем на прадпрыемствы і ў сельскагаспадарчыя арганізацыі, на перанавучанне. Толькі за студзень у раёне было працаўладкавана 60 чалавек. Амаль у два разы вырасла колькасць ахвотных быць самазанятымі: нехта аказвае паслугі насельніцтву па колцы дроў, нехта стрыжэ сабак. Але тут не столькі заслуга камісіі, колькі дзяржавы, якая стварыла для гэтай дзейнасці спрыяльныя ўмовы.

На Магілёўшчыне наводзяць парадак на зямлі

У гэтым рэгіёне з пачатку сакавіка да канца красавіка абвешчаны месячнік па добраўпарадкаванні тэрыторый

«Вясна прыйшла — радасць прынесла», — кажуць у народзе. Сапраўды, з гэтай парой года звязана шмат станоўчых эмоцый, але ёсць і іншы бок, не такі ўжо прыгожы. Снег растае, адкрываючы позірку зусім непрывабныя карціны бурага леташняга лісця, рознага смецця. Натуральна, што патрэбна вялікая ўборка з удзелам кожнага, бо мы павінны праяўляць клопат аб навакольным асяроддзі, у якім жывём.

Напрыклад, у Асіповіцкім раёне кожны чацвер вызначаны адзіным санітарным днём, зацверджаны асноўныя мерапрыемствы па добраўпарадкаванні тэрыторый населеных пунктаў, прадпрыемстваў, арганізацый, паведамляе «Асіповіцкі край».

А Магілёўская раённая газета «Прыдняпроўская ніва» расказвае **аб суботніку, які прайшоў у аграгарадку Масток. Працоўны дэсант, у склад якога ўвайшлі супрацоўнікі ўпраўленняў і аддзелаў раённага выканаўчага камітэта, справіўся з усімі задачамі. На тэрыторыі аграгарадка прыбіралі галінкі, зграбалі лісце, падмяталі, рамантавалі платы.**

Сельгаспрадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі сельсавета, — ААТ «Палыкавічы» і ААТ «Магілёўскі лянок» — далі трактары з прычэпамі для вывазу смецця. Работнікі ДЛГУ «Магілёўскі лясгас» і ДРБУ-128 бензапіламі выразалі хмызняк. Работнікі ўчастка жыллёва-камунальнай гаспадаркі вывозілі на кацельню адходы, якія засталіся пасля абрэзкі дрэў. Работнікі аддзялення паштовай сувязі наводзілі парадак на станцы для аўтатранспарту, прадстаўнікі райветстанцыі прыбіралі прыдарожныя тэрыторыі. Усяго на суботніку працавалі 50 чалавек.

Старшыня Мастоцкага сельскага Савета Валянціна Мацькова не толькі кіравала працэсам, але і прымала самы непасрэдны ўдзел у прыборцы. У суботніку паўдзельнічалі таксама старшыня райвыканкама Анатоль Дуцько і старшыня райсавета дэпутатаў Сяргей Ярошчанка.

www.pniva.by

«Адрамантуем бальніцу разам!»

Акцыя пад такой назвай праходзіць на Крычаўшчыне

Яе мэта — збор сродкаў на завяршэнне рамонту старога лячэбнага корпуса цэнтральнай раённай бальніцы, піша раённая газета «Крычаўскае жыццё».

Значныя сродкі з бюджэту накіроўваюцца на ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя раёна. Дзякуючы гэтаму з'явіўся новы лячэбна-дыягнастычны корпус, адрамантаваная частка старога лячэбнага корпуса. Праводзіцца пастаянная работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы і аснашчэнні новым, сучасным абсталяваннем аддзяленняў установы аховы здароўя раёна.

Завяршэнне рамонту старога лячэбнага корпуса дазволіць, напрыклад, аднавіць работу радзільна-гінекалагічнага аддзялення. У старым лячэбным корпусе таксама плануецца ўстанавіць камп'ютарны тамограф, што дазволіць палепшыць якасць медыцынскіх паслуг, адпадзе неабходнасць паездак у абласны цэнтр.

Журналісты раёнкі заклікаюць чытачоў ахвяраваць хоць бы невялікую суму грошай на рамонт старога лячэбнага корпуса, ад чаго выйграюць усе жыхары Крычаўшчыны.

Па звестках на 14 сакавіка гэтага года, на дабрачынным рахунку — 1721 рубель. Значную суму пералічыў калектыў раённага выканаўчага камітэта (775 рублёў). Зрабілі свой унёсак і калектывы СШ № 8, ясляў-сада № 19, упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, філіяла ААТ «Магілёўсаюздрук». Не засталіся ўбаку і жыхары горада: двое ахвяравалі па 100 рублёў, адзін — 85... Кожнае ахвяраванне набліжае ўвядзенне ў эксплуатацыю старога лячэбнага корпуса. Збор сродкаў працягваецца.

Сродкі можна пералічыць на дабрачынны рахунак BY34AKBB36420007723877300000, адкрыты ў філіяле 714 ААТ «АСБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21714, УНП 700087775.

Адрамантуем бальніцу разам! Гэта будзе годны падарунак усім жыхарам Крычаўшчыны і малой радзіме.

У суботу ў Асіповічах — чэмпіянат краіны

З 22 да 24 сакавіка ў мясцовым ФАК «Юнацтва» пройдуць першынство і адкрыты чэмпіянат краіны ў доўгім цыкле па гіравым марафоне, а таксама адкрыты Кубак Асіповіч па гіравым спорце. Ужо зараз заяўкі на ўдзел падало больш за 120 чалавек з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы, піша раённая газета «Асіповіцкі край».

Рэгістрацыя ўдзельнікаў — 23 сакавіка з 9 да 10 гадзін, урачыстае адкрыццё спаборніцтваў — у 11.00.

У Дрыбінскім раённым Савеце дэпутатаў — новы старшыня

Днямі адбылася чарговая адзінаццатая сесія Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў дваццаць восьмага склікання.

www.dribin.by

У ёй прынялі ўдзел старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Харытончык, старшыня Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта Дзмітрый Гатоўчык, а таксама дэпутаты раённага Савета дэпутатаў, старшыні сельвыканкамаў, кіраўнікі арганізацый раёна, піша раённая газета «Савецкая вёска».

На сесіі на разгляд дэпутатаў райсавета былі вынесеныя справаздачы Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта аб рабоце па сацыяльна-эканамічным развіцці раёна ў 2018 годзе і аб рабоце прэзідыума раённага Савета дэпутатаў па выніках мінулага года. На дванаццатай пазачарговай сесіі райсавета галоўным на парадку дня было пытанне аб датэрміновым вызваленні старшыні Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў Лідзіі Дубікоўскай ад пасады. Лідзія Савельеўна заявіла аб датэрміновым зняцці з сябе паўнамоцтваў старшыні райсавета.

На пасаду старшыні райсавета Дзмітрый Харытончык прапанаваў кандыдатуру Дзмітрыя Пімашэнкі, дэпутата Катэджнай выбарчай акругі № 9, намесніка старшыні райвыканкама.

Тайным галасаваннем дэпутаты раённага Савета дэпутатаў большасцю галасоў прагаласавалі за прапанаваную кандыдатуру на пасаду старшыні Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў.

Дзмітрый ПІМАШЭНКА.

Аб'яднацца, каб атрымаць поспех

У Мсціславе абмеркавалі развіццё турызму і новы турыстычны маршрут

Як паведамляе газета «Святло Касрычніка», раён валодае вялікім турыстычным патэнцыялам. Аб гэтым сведчыла рабочая сустрэча па распрацоўцы новага турыстычнага маршруту на Мсціслаўшчыне, якая адбылася ў райвыканкаме. Удзел у яе рабоце прыняў **першы намеснік старшыні райвыканкама Віктар КАСАЛАПАЎ, дырэктар установы «Рэгіянальны цэнтр развіцця» Яўген ЗУЕЎ, уладальнік аграэкасядзібы Валожынскага раёна Анатоль ГАНЕЦ,** прадстаўнікі аграэкатурызму, рамеснікі.

Адкрываючы мерапрыемства, намеснік дырэктара Рэгіянальнага цэнтра развіцця Аляксандр Сямёнаў адзначыў, што вопыт работы па развіцці турызму ў іншых рэгіёнах краіны паказвае, што на Мсціслаўшчыне выкарыстоўваецца далёка не ўвесь існуючы патэнцыял, хоць яна з'яўляецца вельмі прывабнай для аматараў падарожжаў. У развіцці турыстычнай галіны павінны быць зацікаўлены і тыя, хто займаецца рамяством, занятыя і самазанятыя жыхары.

Цікавым і актуальным было выступленне прадстаўніка Валожыншчыны. Анатоль Ганец, які з'яўляецца ўладальнікам аграсядзібы «Сядзіба Ганка», падзяліўся сваім бачаннем развіцця турызму ў раёне.

— Мсціслаўшчына, нават пры беглым знаёмстве з яе выдатнымі мясцінамі, прыроднымі ландшафтамі, проста здзіўляе, — прызнаўся прадпрымальнік. — У вас захаваліся не толькі выдатныя помнікі архітэктуры, культуры, на якія вы робіце акцэнты, складаючы турыстычныя маршруты. Магу вас запэўніць, што ўвагу прыцягваюць і многія прыватныя дамы, якія маюць архітэктурныя асаблівасці, якія не ўбачыш ні ў адным райцэнтры Беларусі.

— Вясковы турызм як адзін з кірункаў турыстычнай галіны становіцца ўсё больш папулярным, — рэзюмаваў вынік рабочай сустрэчы Віктар Касалапаў. — На Мсціслаўшчыне зарэгістраваны сем аграсядзіб. Выходзячы з вопыту раёнаў, дзе каапэрацыя музейных работнікаў, сельскіх сядзіб, рамеснікаў, арганізатараў актыўнага турызму робіць яго больш эфектыўным, нам таксама варта задумацца аб стварэнні падобнага аб'яднання. Гэта, несумненна, павінна станоўча адбіцца на прыцягненні турыстаў, садзейнічаць развіццю самазанятасці насельніцтва і прынесці дадатковы даход усім, хто зацікаўлены ў развіцці турызму ў раёне.

mstlife.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 21 сакавіка 2019 года.**